ПРАЛЕТАРЫІ УСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# Літаратура і Мастацтва

Год выдання 35-ы
№ 82 (2135)
11 кастрычніка 1966 г.
АЎТОРАК
Цана 4 кап.

ОРГАН МІНІСТЭРСТВА КУЛЬТУРЫ І ПРАЎЛЕННЯ САЮЗА ПІСЬМЕННІКАЎ БССР

ТЫДЗЕНЬ ТАДЖЫКСКАЙ ЛІТАРАТУРЫ Ў БЕЛАРУСІ

# ДАРОГІ ДРУЖБЫ

*Свята Таджыкскай літаратуры ў Беларусі працягваецца. 7 кастрычніка госці з Таджыкістана пакінулі нашу сталіцу і дзвюма групамі адправіліся ў падарожжа па гарадах і вёсках рэспублікі.*

Хлебам-соллю сустрэлі дарагіх гасцей з сонечнага Таджыкістана калгаснікі сельгасарцелі «Зара» Карэліцкага раёна. На здымку вы бачыце ўрачысты момант, калі гасцям падносіць каравай старэйшы хлебароб сельгасарцелі Юльян Сямёнавіч Сыч. Прымае яго вядомы празаік, драматург і перакладчык, член-карэспандэнт Акадэміі навук Таджыкскай ССР Сатым Улуг-задэ.

Фота А. ПЕРАХОДА (БЕЛТА).

## СУСТРЭЧЫ НА СЛУЧЧЫНЕ

Хлебам-соллю сустрэлі ўдзельнікаў Тыдня таджыкскай літаратуры калгаснікі калгаса імя Арджанікідзе. У госці да хлебаробаў прыехалі сакратар праўлення Саюза пісьменнікаў Таджыкістана Фатэх Ніязі, народны паэт рэспублікі Бакі Рахім-задэ, Мумін Канааты, Абдуджабор Кахары, Мухідзін Фархат, Фазлідзін Мухамадзіеў Шаўкат Ніязі. Разам з імі прыехалі беларускія літаратары Іван Шамякін, Сяргей Грахоўскі і Рыгор Барадулін.

Старшыня калгаса А. Шутко расказаў гасцям аб справах працаўнікоў палёў, аб культурным росце вёскі. Пасля гутаркі госці агледзелі гаспадарку, пабывалі на феомах, на будаўнічых пляцоўках калгаса.

Цёпла сустрэлі дарагіх гасцей вучні новай школы-дзесяцігодкі, якая толькі ў гэтым годзе адкрыла свае дзверы для дзяцей калгаснікаў. Таджыкскія госці і іх беларускія сябры выступілі перад школьнікамі з чытаннем сваіх твораў.

Сакратар райкома партыі П. Савасцюк уручыў таджыкскім пісьменнікам памятны падарунак — «Гісторыю Слуцка» — альбом-летапіс горада, які нядаўна адсвяткаваў сваё 850-годдзе. Памятныя падарункі ўручыў гасцям і старшыня калгаса імя Арджанікідзе А. Шутко.

## У БЕЛАРУСКІХ ШАХЦЁРАЎ

У той жа дзень, 7 кастрычніка, таджыкскія літаратары прыехалі ў горад беларускіх шахцёраў Салігорск. Салігорскія гарнякі паднеслі гасцям хлеб-соль.

А ўвечары ў актавай залі прафтэхвучылішча адбыўся вялікі літаратурны вечар. Яго адкрыў першы сакратар райкома партыі М. Сухі. Ад імя жыхароў горада ён цёпла вітаў таджыкскіх літаратараў. Сакратар праўлення Саюза пісьменнікаў Беларусі Іван Шамякін расказаў салігорцам аб літаратуры Таджыкістана, аб развіцці гаспадаркі і культуры братняй рэспублікі.

— Мы рады, што вы пабудавалі за сем гадоў такі вялікі і прыгожы горад, — сказаў, звяртаючыся да жыхароў шахцёрскага горада, сакратар праўлення Саюза пісьменнікаў Таджыкістана Фатэх Ніязі. — І мы вельмі рады пабываць у вас, расказаць вам пра свае справы.

На вечары чыталі свае вершы Мумін Канааты, Сяргей Грахоўскі, Рыгор Барадулін, а таксама маладыя літаратары Салігорска: інжынер Валянціна Далідовіч і камсорг ЦК ЛКСМБ на будоўлях Салігорска Анатоль Крывіцкі.

Таджыкскіх гасцей горача віталі і школьнікі Салігорскай школы № 2, кіраўнік краязнаўчага музея Чапляўскай школы В. Ваньчукевіч, Сакратар райкома партыі М. Сухі ўручыў Фатэху Ніязі шкатулку з наборам мінералаў Салігорскага месцанараджэння.

У заключэнне літаратурнага вечара адбыўся канцэрт самадзейных артыстаў горада.

## ЛЯ СЦЕН МІРСКАГА ЗАМКА

Маршрут другой групы таджыкскіх літаратараў — удзельнікаў Тыдня таджыкскай літаратуры ў Беларусі — ляжаў у калгас «Зара» Карэліцкага раёна. Але па дарозе госці вымушаны былі зрабіць незапланаваны прыпынак — сотні людзей сустрэлі іх кветкамі, «Прывітальнай песняй» Ул. Алоўнікава ля сцен старажытнага Мірскага замка. Тут жа, на дарозе, адбыўся імправізаваны мітынг. Дарагіх гасцей сустракалі сакратар Карэліцкага РК КПБ В. Жураўская і старшыня раённага Савета дэпутатаў працоўных К. Зімнавода. Гасцям быў паднесены хлеб-соль.

— Шлях наш прасцёрся ад заснежаных гор Паміра, — сказаў у сваім выступленні Сатым Улуг-задэ. — І вось ён прывёў нас да вас, да жыхароў слаўнага гарадка з не менш слаўнай назвай Мір. Ад Паміра да Міра! Гэта вельмі хораша, дарагія сябры. Хай жа на нашай зямлі заўсёды будзе мір, хай жа на ёй заўсёды цвіце шчасце і дружба.

А пасля ля сцен замка гучалі вершы. Дружнымі апладысментамі сустракалі міране і жыхары навакольных вёсак выступленні Гульчахры Сулейманавай, Еўдакіі Лось, Абдумаліка Бахары, Файзуло Ансары, Махмуда Вахідава і іншых.

## АЛЕЯ ДРУЖБЫ

7 кастрычніка ўдзельнікаў Тыдня таджыкскай літаратуры гасцінна сустракалі калгаснікі калгаса «Зара» Карэліцкага раёна. У госці да хлебаробаў і жывёлаводаў гэтай вядомай гаспадаркі прыехалі вядомы празаік, драматург і перакладчык, член-карэспандэнт Акадэміі навук Таджыкскай ССР Сатым Улуг-задэ, паэты Файзуло Ансары, Абдумалік Бахары, паэтэса Гульчахра Сулейманава, празаік Джалол Ікрамі, літаратуразнаўца Расул Хадзі-задэ, артыст-чытальнік Махмуд Вахідаў, а таксама беларускія паэты і празаікі Янка Брыль, Еўдакія Лось, Аляксей Карпюк і Генадзь Бураўкін.

А пасля ў велічным Палацы культуры калгаса адбыўся ўрачысты мітынг, які выліўся ў яркую дэманстрацыю дружбы нашых народаў, нашых літаратур.

Старшыня калгаса П. Шчарбакоў, які выступіў на мітынгу, гаварыў аб непарушнай дружбе народаў нашай краіны, аб поспехах працоўных нашай рэспублікі ў будаўніцтве светлай будучыні, пазнаёміў гасцей з дасягненнямі роднай арцелі.

На мітынгу выступілі таджыкскія і беларускія літаратары. Госці шчыра дзякавалі за цёплы прыём, чыталі свае вершы, гаварылі аб сваёй творчасці, аб планах і задумах.

Таджыкскія госці пасадзілі на цэнтральнай сядзібе калгаса алею дружбы, усклалі вянкі да падножжа помніка ахвярам фашызму.

## НА РАДЗІМЕ АДАМА МІЦКЕВІЧА

Вечарам гэтага ж дня ўдзельнікі Тыдня Таджыкскай літаратуры ў Беларусі на чале з Сатымам Улуг-задэ некалькі гадзін правялі на беразе легендарнага возера «Свіцязь», а ўсход сонца 8 кастрычніка сустрэлі на кургане бяссмерця паэту Адаму Міцкевічу ў Навагрудку. Госці з вялікай цікавасцю знаёміліся са старажытным Навагрудкам.

Госці з Таджыкістана і суправаджаючыя іх беларускія сябры наведалі мемарыяльны музей Адама Міцкевіча, дзе агледзелі фатаграфіі, дакументы, асабістыя рэчы Адама Міцкевіча, першыя выданні яго твораў.

Таджыкскія госці ў той жа дзень пабывалі ў рабочым пасёлку Бярозаўка, дзе іх цёпла, сардэчна сустрэлі рабочыя і служачыя вядомага ў нашай краіне і далёка за яе межамі славутага шклозавода «Нёман».

## НА БЕРАГАХ НЁМАНА

Пад вечар таго ж дня, 8 кастрычніка, дэлегацыя таджыкскіх літаратараў прыбыла ў Гродна — старажытны горад на берагах Нёмана. На Савецкай плошчы адбыўся шматлюдны мітынг. Дарагіх гасцей сустракалі гродзенцы хлебам-соллю, жывымі кветкамі. З гарачымі словамі прывітання да пасланцоў Таджыкістана звярнуўся старшыня гарвыканкома Г. Ахрыменка. Са словам у адказ выступіў кіраўнік дэлегацыі таджыкскіх пісьменнікаў Сатым Улуг-задэ.

Увечары ў актавай залі педагагічнага інстытута імя Янкі Купалы адбыўся вялікі літаратурны вечар. Гучалі вершы на таджыкскай і беларускай мовах. Іх чыталі таджыкскія паэты Файзуло Ансары, Абдумалік Бахары, Гульчахра Сулейманава, артыст-чытальнік Махмуд Вахідаў, Еўдакія Лось, Генадзь Бураўкін, Анатоль Іверс.

У заключэнне вечара адбыўся канцэрт гродзенскага народнага ансамбля песні і танца «Нёман».

Раніцою таджыкскія госці пабывалі на беразе Нёмана, там, дзе некалі былі пакладзены першыя каменні ў падмурак горада, наведалі Гродзенскі гісторыка-археалагічны музей, усклалі вянкі на магілу Міхася Васілька і да помніка Элізе Ажэшцы.

## НА СВЯЦЕ Ў «ГВАРДЫІ»

9 кастрычніка ў нашай краіне ўпершыню адзначаўся Дзень работніка сельскай гаспадаркі. Урачыста і велічна адзначалі яго калгаснікі славутага на Гродзеншчыне калгаса «Гвардыя». Свята гэтае было асабліва радасным для хлебаробаў таму, што якраз у гэты дзень да іх прыехалі дарагія госці — таджыкскія пісьменнікі на чале з Сатымам Улуг-задэ і балгарскія паэты Іван Давыдкаў і Найдан Вылчаў, якія таксама госцяць у нашай рэспубліцы.

Свята пачалося ўрачыстым мітынгам у калгасным Палацы культуры. На сцэне — шчодрыя дарункі багатай калгаснай восені: чырванабокія малінаўкі і празрыстыя антонаўкі, трохметровыя снапы кукурузы, паўпудовыя карэнні цукровых буракоў. Мітынг, прысвечаны святу працаўніковаў вёскі, адкрывае старшыня калгаса тав. Абуховіч.

З гарачымі словамі прывітання да гасцей звярнулася настаўніца мясцовай школы П. Васілевіч. Ад імя гасцей выступілі сустрэтыя бурнымі воплескамі Сатым Улуг-задэ і Найдан Вылчаў. Яны шчыра падзякавалі калгаснікам за цёплы прыём, перадалі ім гарачае прывітанне ад земляробаў сваіх рэспублік.

А пасля ў Палацы культуры гучалі вершы — таджыкскія, балгарскія, беларускія. З чытаннем іх выступілі Гульчахра Сулейманава, Данута Бічэль-Загнетава, Абдумалік Бахары, Іван Давыдкаў, Анатоль Іверс. Вершы Мірзо Турсун-задэ чытаў Махмуд Вахідаў.

Паэтаў на сцэне змянілі самадзейныя артысты Гродзенскага раёна.

Пасля канцэрта госці былі запрошаны на сяброўскую вячэру. Ад імя калгаснікаў старшыня калгаса тав. Абуховіч паднёс гасцям памятныя падарункі — посцілкі, вытканыя мясцовымі жанчынамі.

## У ЛЕГЕНДАРНАЙ ЦЫТАДЭЛІ

Учора днём дзве групы таджыкскіх пісьменнікаў прыбылі ў Брэст. З велізарным хваляваннем члены дэлегацыі ўступілі на зямлю легендарнай Брэсцкай крэпасці-героя. Яны пабывалі на месцах жорсткіх баёў ля Холмскіх і Цірасцпальскіх варот, агледзелі свяшчэнныя руіны цытадэлі, якую гераічна абаранялі і воіны-таджыкі.

Навуковыя супрацоўнікі музея гераічнай абароны Брэсцкай крэпасці паднеслі таджыкскім пісьменнікам памятныя падарункі.

□ □ □

На берагах Дняпра і Заходняй Дзвіны, Нёмана і Буга, у гарадах і вёсках Беларусі адбываюцца ўрачыстасці, звязаныя з Тыднем таджыкскай літаратуры і фестывалем таджыкскага кінамастацтва. Свята дружбы нашых народаў працягваецца.

## ВІНШУЕМ З УЗНАГАРОДАЙ

**Міхаіл Ісакоўскі, Яўген Мазалькоў, Аляксандр Пракоф'еў, Якаў Хелемскі — даўнія і шчырыя сябры беларускай літаратуры. У іх выдатных перакладах шматмільённы рускі чытач пазнаёміўся з многімі творамі нашай прозы і паэзіі. Яны — сапраўды паўнамоцныя прадстаўнікі беларускай літаратуры перад рускім чытачом.**

**Плённая праца рускіх паэтаў і перакладчыкаў заўсёды вельмі высока ацэньвалася нашымі літаратарамі і нашай грамадскасцю. А некалькі дзён назад Указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета нашай рэспублікі за вялікую работу па мастацкаму перакладу і прапагандзе беларускай літаратуры Міхаіл Васільевіч Ісакоўскі, Яўген Сямёнавіч Мазалькоў, Аляксандр Андрэевіч Пракоф'еў і Якаў Айзікавіч Хелемскі ўзнагароджаны Ганаровымі граматамі Вярхоўнага Савета БССР.**

□ □ □

За заслугі ў развіцці савецкай літаратуры і ў сувязі з пяцідзесяцігоддзем з дня нараджэння паэтэса Агняцвет (Каган) Эдзі Сямёнаўна ўзнагароджана Ганаровай Граматай Вярхоўнага Савета Беларускай ССР.

## АБМЕНЬВАЮЦЦА ВОПЫТАМ

У Гомельскім парку культуры і адпачынку імя Луначарскага адбыўся рэспубліканскі семінар дырэктараў паркаў, прысвечаны падрыхтоўцы да 50-годдзя Савецкай улады.

Удзельнікі семінара наведалі калгас «Кастрычнік» Веткаўскага раёна. Тут удзельнікі мастацкай самадзейнасці Гомельскага парку далі канцэрт, арганізавалі гульні, атракцыёны, конкурсы.

У дні семінара ў Гомельскім парку праводзіліся спартыўныя гульні, паказальныя выступленні майстроў спорту, вялікае масавае гулянне «Усё для карысці савецкага чалавека». На летняй эстрадзе адбыліся сустрэчы з перадавікамі сельскай гаспадаркі, гандлю і бытавога абслугоўвання, канцэрт мастацкай самадзейнасці Рагачоўскага і Хойніцкага дамоў культуры.

У гэты ж час у парку працавала выстаўка прамысловых і прадуктовых тавараў, садавіны і гародніны. Спецыяльна была арганізавана «алея быту» з удзелам прадпрыемстваў бытавога абслугоўвання горада.

У заключэнне ў парку быў праведзены асенні баль моладзі «Добры дзень, восень залатая».

## БЕЛАРУСКАМУ ТЭАТРАЛЬНАМУ АБ'ЯДНАННЮ — 20 ГОД

Беларускае тэатральнае аб'яднанне (БТА) адзначае сваё дваццацігоддзе. За дваццаць гадоў існавання БТА вырасла ў буйную грамадска-творчую арганізацыю, якая налічвае ў сваіх радах да тысячы чалавек.

Работа БТА непарыўна звязана з творчай дзейнасцю тэатраў. Кансультацыйная дапамога тэатральным калектывам і дзеячам тэатра ў іх рабоце па стварэнню сцэнічных твораў, арганізацыя лекторыяў, семінараў, канферэнцый па праблемах тэорыі і практыкі тэатральнага мастацтва, сустрэчы і дыскусіі па пытаннях творчага жыцця савецкага тэатра, дапамога тэатральным калектывам у фарміраванні рэпертуару — усё гэта будні БТА.

Асноўную ўвагу ў сваёй рабоце аб'яднанне ўдзяляе прафесіянальным тэатрам рэспублікі. Яно арганізуе сістэматычнае абмеркаванне спектакляў тэатраў Мінска і абласных цэнтраў. Арганізаваны лекторый для работнікаў мастацтваў Мінска і абласных тэатраў, дзе чытаюцца лекцыі і даклады па важнейшых пытаннях эстэтыкі і тэатральнага мастацтва. Аб'яднанне прымае ўдзел у рабоце народных універсітэтаў культуры, арганізуе ў іх лекцыі па пытаннях гісторыі тэатра і сцэнічнага мастацтва.

Важнай формай павышэння прафесіянальнага майстэрства з'яўляюцца творчыя камандзіроўкі ў буйнейшыя культурныя цэнтры краіны для членаў БТА. Штогод выдаецца да 60-ці камандзіровак. Пачынаючы з 1963 года, аб'яднанне штогод праводзіць конкурсы і адзначае дыпломамі і памятнымі падарункамі акцёраў, рэжысёраў, мастакоў, дырыжораў і балетмайстраў за лепшыя работы года.

Тэатральнае аб'яднанне збірае, сістэматызуе і вывучае матэрыялы па гісторыі, тэорыі і практыцы тэатра. Сур'ёзная ўвага надаецца фотадакументам, якія адлюстроўваюць гісторыю беларускага тэатра. Фотатэка БТА налічвае звыш 6-ці тысяч негатываў, якія маюць значную каштоўнасць.

Вялікую ўвагу тэатральнае аб'яднанне ўдзяляе народнай творчасці. Яно аказвае народным тэатрам і самадзейным калектывам дапамогу ў выбары рэпертуару, арганізуе лекцыі, даклады, кансультацыі рэжысёраў і акцёраў, удзельнічае ў абмеркаванні спектакляў, у рабоце аглядаў і дэкад народнай творчасці, праводзіць семінары рэжысёраў і мастакоў народных тэатраў і кіраўнікоў драматычных калектываў.

Зараз Беларускае тэатральнае аб'яднанне падводзіць вынікі сваёй работы за дваццаць год і рыхтуецца да чарговага IV з'езда. Учора ў Мінскім Доме мастацтваў адбыўся ўрачысты вечар, прысвечаны 20-годдзю БТА. Са словам аб шляху БТА за 20 год выступіла старшыня прэзідыума праўлення аб'яднання, народная артыстка Саюза ССР Л. П. Александроўская. Беларускіх дзеячоў тэатральнага мастацтва віншавалі шматлікія госці. Сярод іх — М. Зілаў і І. Раеўскі ад Усерасійскага тэатральнага аб'яднання, Эльфрыда Пакуль з Латвіі, група майстроў мастацтва з Украіны, прадстаўнікі абласных аддзяленняў БТА і кіраўнікі тэатраў рэспублікі. Вечар закончыўся канцэртам.

## АРШАНЦЫ Ў МАСКВЕ

Народны тэатр Аршанскага ордэна Леніна льнокамбіната — адзін са старэйшых самадзейных калектываў рэспублікі.

У тэатры пастаўлены такія спектаклі, як «Трэцяя патэтычная», «Бітва ў дарозе», «Іркуцкая гісторыя», «Рэвізор», «Любоў Яравая», «Платон Крэчат». Гэтыя спектаклі глядзелі рабочыя і калгаснікі Віцебскай, Гомельскай, Магілёўскай, Мінскай і Смаленскай абласцей. 28 з 60 удзельнікаў калектыву прысвоена званне артыста народнага тэатра.

9 кастрычніка па запрашэнню Крамлёўскага тэатра самадзейныя артысты выехалі на гастролі ў Маскву.

Па дарозе яны спыніліся ў горадзе Сафонаве Смаленскай вобласці, дзе выступілі перад шахцёрамі.

На сцэне Крамлёўскага тэатра аршанцы пакажуць адну з лепшых сваіх работ — спектакль «Крамлёўскія куранты» на п'есе М. Пагодзіна.

У ролі Леніна выступіць ветэран тэатра — начальнік мастацкай майстэрні камбіната Б. Арлоў. Ролю матроса Рыбакова выканае слесар Л. Трушко, інжынера Забеліна — рэжысёр тэатра І. Шварц. Ролю жонкі Забеліна іграе А. Прылуцкая. Артысты нядаўна віншавалі яе з 60-годдзем з дня нараджэння, 40-годдзем удзелу ў самадзейнасці і 20-годдзем працы ў калектыве народнага тэатра.

Акрамя Крамлёўскага тэатра, аршанцы выступяць на сцэне палацаў культуры буйнейшых тэкстыльных прадпрыемстваў Масквы і Падмаскоўя — на «Трохгорнай мануфактуры», камбінаце «Чырвоны сцяг» у Раменскім, Ягор'еўскім камбінаце «Правадыр пралетарыята».

Да 50-годдзя Савецкай улады Аршанскі народны тэатр рыхтуе спектакль «Чалавек з ружжом». Гэтым спектаклем будзе завершана работа тэатра над пагодзінскай трылогіяй, прысвечанай Уладзіміру Ільічу Леніну.

## БЕЛАРУСЬ АРХІТЭКТУРНАЯ

### КАЛГАСНЫ ПАЛАЦ КУЛЬТУРЫ



Макет гэтага дома наш фотакарэспандэнт зазняў у адной з майстэрняў праектнага інстытута «Белгіпрасельбуд». Неўзабаве дом стане на цэнтральнай сядзібе вядомага калгаса «Рассвет» Магілёўскай вобласці, дзе старшынёю Кірыл Арлоўскі. Называцца ён будзе Палацам культуры. Акрамя вялікай залы на 950 месц з вялікай сцэнай, якая можа прыняць любы тэатр, тут размесцяцца праўленне калгаса, бібліятэка, аграмузей, пакоі для клубнай работы. Гэта будзе квадратная будыніна. У цэнтры ўтвараецца ўнутраны дворык, дзе будзе зімовы сад. Розныя памяшканні, службы, фае робяцца з разлікам на магчымасць паралельнай работы.

Будынак мае сучасны выгляд. Тут усё са шкла і бетону. Пры будаўніцтве будуць скарыстаны уніфікаваны жалезабетонны каркас, металічныя фермы, маналіты жалезабетон.

Аўтар праекта — архітэктар Г. Заборскі.

З БЛАКНОТА ЖУРНАЛІСТА

# ПРАВІНЦЫЯЛІЗМ НА П'ЕДЭСТАЛЕ

Святлана МАРЧАНКА

— Касцюковічы — не лепшы і не горшы раённы цэнтр на Магілёўшчыне, — даводзіў мне ў вагоне прыгараднага цягніка адзін пасажыр.

Каму як, вядома. Асабіста мне Касцюковічы (мо таму, што тут прайшло маё дзяцінства, адсюль пачаўся вялікі свет і жыццёвыя дарогі) трэба было б лічыць райскім месцам. Некалі яно так і было, і пісалася вось так:

Што такое райцэнтр?
Райцэнтр — гэта цэнтр Рая:
Сто крокаў — і ты на рацэ,
Крокаў дзвесце — любуйся гаем.

Знаёмы малады паэт, чалавек крышачку педантычны, забракаваў гэтае маё чатырохрадкоўе — маўляў, яму нестае грамадска-палітычнай важкасці. Меў паэт, цяпер і сама бачу, рацыю. Пасля незабыўнага дзяцінства я жыву новым светаўспрыманнем. Але часам з затоеным сумам вымушана згаджацца з далёка не лепшай (прыкладна такой, якую даў пасажыр) характарыстыкай свайго роднага мястэчка, бо калісьці здавалася, што тое сённяшняе, што ёсць у ім, будзе інакшае, лепшае...

Мне давялося пабываць амаль ва ўсіх раённых цэнтрах нашай вобласці. Для большасці з іх характэрна рыса так званай «аўтаномніі» — размяшчэнне ўстаноў і прадпрыемстваў сферы культурна-бытавога абслугоўвання ў пэўным мікрараёне. Вось і ў Касцюковічах: школа, сад-яслі, універмаг, пошта, кіёскі, камбінат бытавога абслугоўвання, нават пажарная каланча — на адной цэнтральнай вуліцы.

Аб'ектаў гістарычнай дзейнасці касцюкоўцаў ці якіх-небудзь славутых мясцін тут, на жаль, няма. Прыезджаму, на свежае вока, не так і проста заўважыць градацыю росту райцэнтра. Аднак тутэйшым жыхарам шмат чаго відно. Апошнія гады мястэчка прыгажэе, расце. На кожным кроку — новае, змены. Часам яны дробныя, але ўсё ж істотна змяняюць «фізіяномію» гарадка.

Стаяў, напрыклад, калісьці на гарадской плошчы калодзеж-рыпун. Бяруць з яго ваду, дык так разрыпіца — на дзве вуліцы чутно. Здарылася так, што калодзеж нехта апаганіў: аднойчы выцягнулі з яго тапеліцу-кошку. З таго часу ні адна руплівая кабеціна не кланялася вядром былому паіцелю. Забыты, ён абімшэў, пахіліўся і доўга стаяў так — чакаючы нейкай рады. Нарэшце, работнікі камунгаса далі гэтую раду — засыпалі яго. Ваду цяпер выдаюць кабетам калонкі. Націсні на рычажок — і вёдры поўныя. Плошча ж, вольная ад старога, збуцвелага калодзежа, лепш стала імпанаваць будовам, парку, якія акаймляюць яе. І вуліца стала зручнейшая для руху транспарту.

Або вось летні гандлёвы павільёнчык ці зграбны, сучаснай формы кіёск. Для вялікага горада — яны не дзіва. А з'явіліся ў Касцюковічах — глядзіш, прыкметная аздоба для горада. Для вуліцы, у прыватнасці.

Сёлета касцюкоўцы пасадзілі ў сваім гарадку каля тысячы дрэўцаў. Гэта малады парк. Тое ж самае: глядзіш — і прыгажэй вакол стала. Хіба гэта не прыкметная рыса новага? Зеляніна — заўсёды свежасць і навізна.

А двухпавярховыя дамы, новы кінатэатр, які будуецца?

Словам, Касцюковічы — гэта райцэнтр-падлетак. Ён рос памаленьку, расце і будзе расці...

Ды вось якая аказія! Ды вось якая калізія!

Вельмі ўжо адчувальна заяўляе ў горадзе аб сабе старамоднасць, так званы правінцыялізм. І не таму, што справа добраўпарадкавання, росту мястэчка звязана з пэўнымі матэрыяльнымі цяжкасцямі. Пайшлі ж, напрыклад, як з-пад малатка, грошы на агароджу, якая трымае ў палоне кветкі і маленькія дэкаратыўныя елачкі прама каля райкома партыі. Мілыя, бездапаможныя кветкі! Супраць сваёй волі, з усёй сваёй духмянай выразнасцю падкрэсліваюць яны нашы чалавечыя недахопы. У іншых жа гарадках, бачыла я, кветкі, зеляніна — свабодныя, не за агароджай.

Думаецца, што і касцюкоўскія ўхажоры па вушы нават уцялюсканыя ў сваіх дзяўчат, не рызыкнулі б разбураць пялёсткавы, пчаліны рай, калі б ён і не быў агароджаны...

Ладнаватая сума выдаткавана і на высокі плот, які аперазаў стары парк, хоць злодзею тут і красці няма чаго. Хіба толькі дрэва з карэннямі. Дык наўрад ці адважыцца на гэта злодзей. Урэшце, да міліцыі — рукой падаць.

Не адным рублём пахне і тратуар некалькіх разнавіднасцей — бетонны, цагляны, драўляны, усюды латаны і пералатаны.

Сродкі, сродкі, сродкі... Іх хапіла б ужо на тратуар новы, трывалы, зручны, аднародны!

Дык вось, шмат прымітыву ўзнікае хутчэй па той прычыне, што ў добрай справе ўпарадкавання горада ёсць нейкае сляпое раўнанне на нізкія, спрадвечныя стандарты прыгажосці — без уліку патрэб людзей, без уліку запатрабаванняў сённяшняй эстэтыкі.

Праілюструю сваю думку.

На двары гарадской лазні размешчаны склад Касцюковіцкага райкамунгаса. Цяпер ён нагадвае звалку. Адбітыя гіпсавыя галовы, рукі, ногі — «фрагменты» скульптур — валяюцца тут. Перш чым узыйсці на п'едэсталы, гэтым скульптурам давядзецца напачатку прайсці поўную рэстаўрацыю. Іх нават не пашкодзіць і ў лазні памыць. Ну, але, дапусцім, іх памыюць, рэстаўрыруюць і паставяць на п'едэсталы. Ці ўпрыгожаць яны наш гарадок? Цяжка прадбачыць.

Я бачыла гэтыя скульптуры на фотакартках у дырэктара камунгаса тав. Рыбчынскага. «Узоры» сваёй прадукцыі даслала на адрас райкамунгаса Харкаўская скульптурная фабрыка.

Вось, напрыклад, скульптурная кампазіцыя «Свету — мір». Жанчына ў доўгай спадніцы, з сярпом у руках, з немаўляткам на плячы. На сённяшні дзень, пры ўсёй высакароднасці і актуальнасці задумы, «твор» гэты выклікае непаразуменне. Сапраўды, чаму пампезная маладая кабета, ідучы на работу, не здагадалася аднесці малое ў яслі, скажам? (І ў Касцюковічах жа ёсць светлы двухпавярховы будынак «Сад-яслі», сапраўдны дзіцячы палац). Ды і куды яна з сярпом? Ён жа, гаворачы словамі аднаго нашага паэта, «пад страхою ў сяле іржавее, быццам бы зброя старая ў музеі».

Каравей, будзе гэтая скульптура ўстаноўлена, дык узвысіцца, абяссмерціцца на некалькі дзесяткаў гадоў прымітыў і анахранізм.

Ну, а залежы на двары лазні «фрагментаў» скульптур футбалістаў, баскетбалістаў, гімнастаў? Падножкі для іх у горадзе амаль гатовы. Уявіце сабе, якая форма ўвагі будзе ўвекавечаным спартсменам, калі кожны наш гараджанін ведае, што спартыўная работа ў раёне і горадзе жадае быць намнога лепшай, што гарадскі стадыён (калі яго можна так назваць) скапычаны жывёлай, перарэзаны паскам дарогі? Можа і зірне хто-небудзь мімаходзь на застылы спрыт, сілу і прыгажосць гіпсавых цел фізкультурнікаў, але перш за ўсё яго галаву будзе свідраваць пытанне: дзе, у гразішчы якой вуліцы — Мядзвёдаўкі, Пескавахі ці Прылепаўкі — згубіў ён свае галёшы.

Рэзюміраваць буду проста і коратка: шэсць тысяч трыста рублёў (кошт скульптур) хай бы пайшлі разам з будматэрыяламі, з трывалым «матэрыялам» фантазіі і настойлівасці камунгасаўскіх «дойлідаў» на брукаванне вуліц, на тратуары, на добраўпарадкаванне стадыёна, на рамонт камунальных дамоў, на ачыстку рачулкі Жадункі ад раскі і іншага бруду.

Дарэчы, пра рачулку Жадунку, хаця з ёй і не лічацца вялікія геаграфічныя карты, яе апелі і перапелі ўсе мясцовыя паэты. Яна сапраўды прыгожая. Бяда толькі, што з яе прыгажосцю не ўсе лічацца. Спускаюцца з лазні, з адкормачнага пункта ў рэчку нечыстоты. Шафёрская брацця мые ў Жадунцы закіданыя дарожнай граззю «казлы» і грузавікі. А Жадунка, калі разабрацца, не толькі паэтычнае натхненне, не толькі выгада з падлешчыкам. Яна перш за ўсё — зона адпачынку для працоўных. Таму — час раённым кіраўнікам сказаць сваё слова пра Жадунку...

Не буду загортваць смеласць у вату, а выкажу можа чыста суб'ектыўную думку. Дух правінцыялізму ў Касцюковічах цвіце па прычыне слабога ўздзеяння на будзённае жыццё інтэлектуальных сіл горада — дзесяткаў настаўнікаў, урачоў, інжынераў і кіруючых работнікаў.

Часта можна бачыць, як перад пачаткам чарговай лекцыі альбо тэматычнага вечара нервова пахаджвае ў фае, раз-пораз зазіраючы ў глядзельную залу, дырэктар РДК Уладзімір Васільевіч Мяснікаў. Дырэктар хвалюецца: трэба пачынаць лекцыю, а слухачоў няма. Не ідуць на лекцыі рабочыя, маладыя людзі. Але ж — што патрабаваць ад рабочага, ад юнака-шафёра ці дзяўчыны-прадаўшчыцы, калі інтарэсы многіх урачоў, інжынераў, настаўнікаў не ідуць далей рэстарана, сямейнай ідылі і

[Заканчэнне на 2-й стар.].

Гэты здымак зроблены на вечары, прысвечаным адкрыццю Тыдня таджыкскай літаратуры ў Беларусі. Паэт Мумін Канааты дае аўтографы аматарам паэзіі.

Фота Ул. КРУКА.

# З НАВАСЕЛЛЕМ, ЛЯЛЬКІ!

Лялькі атрымалі свой дом. І зусім не лялечны.

Мы ў Мінску, на вуліцы Энгельса, 20. Тут, пад адным дахам з новым кінатэатрам «Піянер», цяпер будзе і Дзяржаўны тэатр лялек.

Тэатр існуе шаснаццаць год, але стацыянарнае памяшканне атрымлівае ўпершыню. Будынак, у якім раней працаваў калектыў, меў усё, акрамя... глядзельнай залы. Падзяліўшыся на групы, акцёры выязджалі ў школы, клубы, дамы адпачынку. Летам паказы ішлі на свежым паветры.

«Умовы жыцця» дыктавалі своеасаблівыя формы работы. Па сутнасці ў тэатры існавалі тры калектывы — са сваімі акцёрамі, музыкантамі адміністрацыйнымі работнікамі. Кожная група мела свой рэпертуар і самастойна рыхтавала спектаклі. Тэатр служыў толькі базай.

Нехта падлічыў, што артысты наездзілі 825 тысяч кіламетраў, далі звыш 17 тысяч паказаў. Мінскіх лялечнікаў бачылі ва ўсіх кутках рэспублікі, яны выступалі перад дзецьмі Літвы, Латвіі, Смаленскай, Бранскай і шмат якіх іншых абласцей.

Дык што ж, канец гастрольнаму жыццю? Вядома ж, не. Але цяпер афішы з маркай Дзяржаўнага тэатра лялек БССР ужо не знікнуць з рэкламных шчытоў.

Новы час — новыя клопаты. Трэба ў адзіны калектыў зніваць разрозненую трупу і... захаваць у мабільным стане ранейшыя гастрольныя калектывы. Выезды ж не спыняцца, хоць на сцэне і будуць пастаянна ісці спектаклі. А як часта даваць гэтыя спектаклі, як заваяваць новага гледача? У тэатра ж з'явілася магчымасць рыхтаваць пастаноўкі і для дарослых, выпусціць нават свой абанемент.

З галоўным рэжысёрам Анатолем Ляляўскім мы доўга гаворым аб перспектывах, якія адкрыліся перад самым юным тэатрам сталіцы. Чалавек улюбёны ў сваю справу. Ляляўскі за дзевяць год работы ў тэатры паставіў каля сарака спектакляў.

Перад уваходам у тэатр.

Хутка спектакль Акцёры-лялькаводы Б. Мікула, А. Варэннік, К. і Ул. Калашнікавы рыхтуюцца да выхаду на сцэну.

Галоўныя дзеючыя асобы.

А гэта—першыя гледачы...

З задавальненнем гаворыць Анатоль Аляксандравіч пра дружны калектыў лялечнікаў. Усе акцёры любяць свой тэатр. Але ў лялечнікаў яна, гэтая любоў, асаблівая, бо на яе долю выпадаюць немалыя дадатковыя выпрабаванні. З першага дня ў трупе Уладзімір Калашнікаў, трошкі пазней прыйшлі Лідзія Мікула, Кацярына Калашнікава. Здольнымі лялькаводамі паказалі сябе Уладзіслаў Уласаў, Міхась Каладзінскі, Аляўціна Іванова.

Сёлета тэатр прыме ўдзел у першым фестывалі лялечных тэатраў Прыбалтыкі і Беларусі. Вельмі добра, што гэта падзея супадае з пераходам на стацыянарнае жыццё.

А якое яно будзе, гэтае жыццё? Калі ласка, глядзіце самі.

Анатоль Аляксандравіч паказвае новае памяшканне. Глядзельная зала вельмі ўтульная, з добрай акустыкай, на 350 месц. Сцэна з сучасным абсталяваннем (ёсць нават спецыяльная апаратура для музычнага суправаджэння, праўда, нялёгка з ёй, лялечніні ж прывыклі да звычайнага гармоніка). Фае... Вось з фае пакуль што не вельмі. Яно ў лялечнікаў агульнае з кінатэатрам «Піянер». Два гаспадары, розныя відовішчы. У кінатэатры сеансы пачынаюцца ў адзін час, спектаклі ў тэатры—у другі. У тэатры гледачы здымаюць верхнюю вопратку, у кінатэатры — не. І тут і там — дзеці, за параднам толькі сачы...

Цяжкасці — і творчыя, і арганізацыйныя — не псуюць, аднак, святочнага настрою. У лялек наваселле — значыць, наваселле ва ўсёй мінскай дзятвы. У гэтым сезоне маленькія гледачы ўбачаць спектаклі «Дзед і жораў», «Доктар Айбаліт», «Іван-царэвіч і шэры воўк», «Тыграня Петрык», «Канёк-гарбунок». Рыхтуецца да пастаноўкі спектакль «Прыгоды Пін-Піна». Да 50-годдзя Савецкай улады тэатр паставіць «Ваенную тайну», «Чырвоную зорачку», капітальна адновіць старую пастаноўку «Хлопчык з Князь-возера».

К. САТОВІЧ.

ПА ВЫСТАВАЧНЫХ ЗАЛАХ

# ПРЫЕМНАЯ І ЦІКАВАЯ СУСТРЭЧА

Нядаўна ў залах Дома работнікаў мастацтваў адкрылася выстаўка беларускага мастака кіно Ул. Белавусава. З яго работамі мы сустракаліся і на папярэдніх выстаўках. Сёння яго творчасць прадстаўлена больш поўна і разнабакова.

На малюнку цяжкія змрочныя скляпенні «Камеры смяротніка» з кінафільма «Чырвонае лісце». Мова мастака мужная і стрыманая. Іншыя выяўленчыя сродкі выкарыстоўвае мастак у эскізах да фільма-канцэрта «Пасля трэцяга званка». Тут больш урачыстасці, канцэртнай святочнасці. У эскізах да кінафільма «Рагаты бастыён» Ул. Белавусаў выкарыстоўвае гратэск. А вось «Пагоня» з кінафільма «Чужое імя». Колькі тут дынамікі, напружанасці! І нізкі гарызонт, і стромкія ствалы дрэў, і чорныя цені—усё стварае напружаную атмасферу.

Эскізы да кінафільма «Чужое імя», мне здаецца, найбольш цікавыя. Напружанасць, дынаміка характэрна для работ «Падвал гестапа», «Ускраіна вёскі» «Каменданцтва», «Каля дома эсэсаўца».

Ул. Белавусаў працаваў над фільмамі «Палеская легенда», «Строгая жанчына», «Першыя выпрабаванні», «Апавяданні пра юнацтва» і ў кожным з іх імкнуўся зрабіць так, каб дэкарацыя дапамагала найбольш поўна выказаць ідэю твора, дапамагла рэжысёру і аператару знайсці эмацыянальнае адчуванне атмасферы дзеяння. Аднак на выстаўку не трапілі многія матэрыялы, якія дазволілі б пазнаёміцца з работай мастака на розных этапах стварэння фільма. Можна было б прадставіць папярэднія графічныя распрацоўкі, накіды, кадроўку, якія расказвалі б аб пошуках выразнасці той ці іншай сцэны, гэта дапамагло б больш поўна зразумець работу мастака.

Шмат увагі і часу аддае мастак Ул. Белавусаў станковаму жывапісу. На выстаўцы мы пазнаёміліся са шматлікімі пейзажамі, эцюдамі, накідамі. Карціны «Заліты луг» і «Маскоўская шаша», «Каля крыніцы» і «Сож разліўся», эцюды «Лістапад» і «Вулачка ў Мядзелі», «Свежы снег» і «Полацкі Нафтабуд», нацюрморты «Рамонак» і «Бэз» гавораць аб улюбёнасці мастака ў хараство роднай прыроды, аб яго замілаванні да ўсяго прыгожага, што нас акружае.

Сустрэча з мастаком Ул. Белавусавым прыемная і цікавая.

Будзем спадзявацца, што падобныя выстаўкі ў Доме работнікаў мастацтваў стануць традыцыйнымі.

П. КАРНАЧ.

# ПРАВІНЦЫЯЛІЗМ НА П'ЕДЭСТАЛЕ

[Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.].

ці баталіі. А хто ж, як не інтэлігенцыя, павінен вызначаць атмасферу духоўнага жыцця горада?..

Чаму ж не прыходзяць нават на лекцыі сваіх калег работнікі ідэалагічнага фронту? Ім жа несці ў масы страснае слова аб неабходнасці паляпшэння эстэтычнага выхавання насельніцтва! Якая ж цана будзе іхняму слову?..

Яшчэ ў больш спрыяльных умовах жывуць бацылы правінцыялізму на вёсцы.

Нядаўна камандзіроўка паклікала мяне ў дарогу. З хуткасцю «газіка» мільгалі вуліцы і завулкі вёсак Дзямідавіцкага сельсавета. І на працягу амаль усёй дарогі нельга было адмахнуцца ад думкі, што будаўніцтва ў вёсках вядзецца занадта хаатычна. Ёсць вёскі доўгія і вёскі-каратышкі. Ёсць ашаляваныя хаты з трыма вокнамі на сцяну, з дахам, што адсвечвае на сонцы шыферам, і тут жа звешваюць на бакі саламяныя пачарнелыя чубікі хаткі, пра якія даўно сказана — аджылі сваё.

— За апошнія тры гады ў нас пабудавана 76 дамоў і 37 капітальна адрамантавана,—пахваліўся мне старшыня Дзямідавіцкага сельскага Савета тав. Дзямідаў.

Я не ведаю, многа гэта ці мала для аднаго сельсавета. Пэўна, не больш і не менш, чым у іншых сельсаветах раёна. Увесь эфект гэтых лічбаў можна было б праверыць простым арыфметычным дзеяннем: падзяліць наяўную жыллёвую плошчу на колькасць насельніцтва. На вялікі жаль, такія статыстычныя дадзеныя тав. Дзямідаў паведаміць мне не мог.

А ў наяўнасці паўсталі факты такога парадку, факты ўсё таго ж правінцыялізму.

Даўно абяцалі калгасніцы Хадосцы Клімянковай—і ў сельсавеце, і ў праўленні калгаса «Радзіма»—пабудаваць хату. Але толькі, на жаль, паабяцалі... Старая будыніна сапрахнела на рэшата. І вецер у яе зойдзе, і дождж пральецца. Бацька Клімянковай, 93-гадовы Панас, былы калгаснік, яшчэ зусім нядаўна пасвіў кароў, коней. Крыўдуе стары, скардзіцца. У яго ёсць здабытае ўласным мазалём права на крыўду.

Сёлета, як ніколі, наша дзяржава паклапацілася, каб было дастаткова будаўнічых матэрыялаў. Адпаведная колькасць іх была выдзелена Дзямідавіцкаму сельсавету. Было запланавана пабудаваць у гэтым годзе 8 дамоў за кошт грамадскіх сродкаў калгасаў. Але тут не прыступілі яшчэ да будаўніцтва і рамонту. А калгас «Дружба» не завёз нават лесаматэрыялу.

За непаваротлівасцю, інертнасцю кіраўнікоў праглядвае іх абыякавасць да чалавека. У Дзямідавічах я сутыкнулася з вока на вока з бяздушшам. І абыякавасць, і бяздушша таксама ўкладваецца ў рамкі шырокага вызначэння — правінцыялізму...

Пастукалася ў хату папрасіць вады напіцца. Доўга ніхто не адгукаўся, хоць дзверы былі расчынены. Рашыла зайсці. У хаце было двое—сухенькая бабулька і дзядок. Апошні ляжаў на ложку і ціха, па-старэчы, войкаў. Вакол было запушчэнне і бядота. Я разгубілася, забылася на тое, чаго зайшла, і спыталася:

— Як жа вы тут жывяце?

Азвалася старая:

— Хварэе мой Майсей. І я хварэю. Соўгаюся праз сілу.

Слова за слова, і я даведалася, што размаўляю з 83-гадовай Мар'яй Ільінічнай Жбанковай — роднай сястрой Стратоніка Ільіча Жбанкова. Імя гэтага чалавека легендарнае на Касцюкоўшчыне. Ён—член КПСС з 1917 года; першы арганізатар партыйнай арганізацыі ў былым Клімавіцкім павеце, дэлегат 3-га і 5-га Усерасійскіх з'ездаў Саветаў, сустракаўся і гутарыў з Уладзімірам Ільічом Леніным. Зараз Стратонік Ільіч—персанальны пенсіянер, жыве ў Маскве, сам цяжка хворы. Толькі пісьмы звязваюць старога камуніста з бацькаўшчынай, з родным домам.

— Мар'я Ільінічна, а што, калі б вы разам з вашым Майсеем Сяргеевічам падаліся ў Дом састарэлых? — паспрабавала я схіліць старую на думку, якая, мне здавалася, была дарэчы. Я ведала, што гаварыла. Мне даводзілася бываць у Бялынкавіцкім Доме інвалідаў. Чыста, акуратна ў яго пакоях. Утрыманцы акружаны клопатам, кругом гадзеджаны, у іх добры настрой, наладжваюць нават канцэрты мастацкай самадзейнасці.

Аднак субяседніца мая насцярожылася. І я яе зразумела. Можна, урэшце, жыць і ў сваім родным куце. Вось толькі была б увага і клопат чалавечы. А тут... Апошнія гады людзей, якія пражылі добрае, карыснае жыццё, азмрочыла, зняважыла тупое правінцыяльнае раўнадушша маладых і здаровых людзей.

З патэнцыяльным зарадам гневу і злосці выскачыла я з хаты. Доўга шукала старшыню тутэйшага калгаса «Радзіма» Агеева, які яшчэ ў мінулым годзе абяцаў старым: «Дроў прывязём, дах залатаем». У праўленні мне сказалі:

— На курорт паехаў.

— Захварэў?

На маё пытанне праўленцы адказалі хітраватымі ўсмешкамі і маўчаннем. Нічога сабе! Бясхмарны адпачынак наладзіў старшыня ў час уборкі, у час гарачых сельскагаспадарчых работ...

Сустрэла я зноў старшыню сельсавета Дзямідава. Маўляў, так і так: абяцаў старшыня «Радзімы» сваім былым калгаснікам дапамагчы, а слова не трымае. Спахмурнеў Дзямідаў:

— Я ж яму, сукінаму сыну, гаварыў: дравец хаця прывязі...

Не толькі на памяці да загінуўшых, але і на павазе да жывых герояў выхоўваюцца пакаленні. Колькі мы ведаем штодзённых прыкладаў увагі і цёплых клопатаў аб ветэранах Радзімы, аб іх сем'ях, родных. Тым больш непрыемны факт у Дзямідавічах. На жаль, ён не адзіны. У вёсцы Кульгаеўка (калгас «Дружба») начыста заарана і не адноўлена магіла віднага рэвалюцыянера Уладзіміра Дзмітрыевіча Бонч-Бруевіча.

□ □ □

Кажуць, ёсць праўда патрэбная і непатрэбная, тыповая і нетыповая, вялікая і малая, маштабная і немаштабная. Я выказала не дужа прыемную праўду. Але спадзяюся, што за мінорны лад тэзіс нататак да мяне не будуць у прэтэнзіі чытачы. Мне хацелася з няшчаднай дакладнасцю нагадаць (усім, каго гэта датычыцца) аб тым, што існуе жыццё па вялікім рахунку, што аджытае нельга ўзводзіць на п'едэстал, што бяздушша ніколі не будзе замоўчвацца.

# СТО ЛІСТОЎ ШЧЫРАСЦІ

Каля ста твораў—лістоў графікі і акварэлі прадстаўлена ў экспазіцыі персанальнай выстаўкі гомельскага мастака Фёдара Мохаўцава, якая нядаўна адкрылася ў Гомельскім Палацы чыгуначнікаў імя Ул. І. Леніна. Яна прысвечана 50-годдзю з дня нараджэння і 30-годдзю творчай дзейнасці старэйшага мастака горада.

Шлях Ф. Мохаўцава ў мастацтве пачаўся ў 30-х гадах. Аднак на выстаўцы пра мастака мы можам меркаваць па работах, створаных у пасляваенны час.

Лісты графікі адносяцца да 40-х—50-х гадоў. Сярод іх многа партрэтаў. Мы бачым імкненне мастака глыбока пранікнуць ва ўнутраны свет людзей. Найбольш цікавыя партрэты «Перадавы машыніст Гомельскага паравознага дэпо Іваноў», «Работніца камбіната «Спартак» Зайцава», «Настаўнік Мядзведзеў», «Калгасны вартаўнік».

Большую частку экспазіцыі складаюць акварэлі. Асноўная іх тэма—расказ пра родны край. У пейзажах мастак імкнецца перадаць стан прыроды, яе прыгажосць і ўзаемаадносіны з чалавекам.

З любоўю мастак піша і ціхую роўнядзь ракі з першымі промнямі сонца, і спякотны летні дзень, і цішыню восені («Раніца над Сожам», «Лодачкі», «Асенні луг», «Воблакі»). У пейзажах Ф. Мохаўцава адчуваецца прысутнасць чалавека, хоць ён не намаляваны на іх. Найбольш пераканаўча гавораць пра гэта акварэлі «Збожжа скошана», «Мікраён».

Трэба сказаць, што найбольш удалыя тыя работы Ф. Мохаўцава, дзе ён паказвае пахмурны, ціхі дзень. Мастак тонка адчувае стан прыроды («Цішыня», «Асенні дзень»). Гэтыя творы вызначаюцца лірычнасцю, шчырасцю. Добра адчуваеш восень з яе асаблівым «насычаным» паветрам.

Неабходна адзначыць, што многія акварэльныя работы Ф. Мохаўцава манахромныя і незавершаныя. Гэта хутчэй за ўсё матэрыял для стварэння вялікіх абагуленых кампазіцый. Хацелася б, каб мастак перапрацаваў эцюды і стварыў закончаныя творы.

Р. ЛАНДАРСКІ,
А. ШНЫПАРКОЎ.

г. Гомель.

Гэта аддзел букіністычнай кнігі, які нядаўна адкрыўся ў Гомельскім кніжным магазіне № 6. За кароткі час ён стаў папулярным у горадзе. Сюды ахвотна прыносяць кнігі працоўныя Гомеля. Скупка кніг у насельніцтва з кожным днём павялічваецца. Бойка ідзе гандаль. У аддзеле багаты выбар кніг: ёсць мастацкая літаратура, многа падручнікаў для студэнтаў вну і тэхнікумаў, трапляюцца часам і рэдкія выданні.

Аддзелы букіністычнай кнігі будуць адкрыты ў бліжэйшы час у Гродна, Брэсце і іншых абласных цэнтрах рэспублікі.

Фота Ул. КРУКА.

ГРАМАДСКІ АГЛЯД БІБЛІЯТЭК

# СЯБРЫ СУСТРЭЛІСЯ ЗНОЎ

У Маскве на Усесаюзнай нарадзе лепшых бібліятэчных работнікаў краіны Ігар Алексіевіч пазнаёміўся з Саятам Джараевым з Туркменіі. Абодва яны загадваюць раённымі бібліятэкамі — адзін у Крупках, другі—у далёкім Саяце. Вось тады, пяць гадоў назад, дамовіліся бібліятэкары абменьвацца літаратурай, метадычнымі дапаможнікамі, дзяліцца вопытам, спаборнічаць, памагаць адзін аднаму. Два разы ў год падводзіліся вынікі работы двух невялікіх калектываў.

Сёлета сябры рашылі сустрэцца, пагутарыць аб тым, што зроблена за апошнія пяць гадоў. Не з пустымі рукамі ехаў у Саят Ігар Алексіевіч. У рэчавым мяшку і чамадане ляжалі навінкі беларускай літаратуры, метадычныя распрацоўкі, рэдкія кнігі. Саяту Джараеву ён дапамог стварыць пры бібліятэцы метадычны кабінет.

18.000 кніг і 580 чытачоў—гэта не вельмі многа для саятцаў. Аб гэтым гаварыў сябру, а таксама супрацоўнікам Саяцкага раённага аддзела культуры лепшы бібліятэкар Беларусі. Саят уважліва слухаў парады вопытнага таварыша, які вось ужо дваццаць два гады загадвае Крупскай раённай бібліятэкай.

А нядаўна ў Крупкі прыехаў далёкі і ў той жа час блізкі сябар Ігара Алексіевіча — Саят Джараеў. Яго здзівіла тое, што на паліцах Крупскай раённай бібліятэкі — 55 тысяч экземпляраў рознай літаратуры, якую пастаянна чытаюць больш за 3 500 чалавек. За восем месяцаў гэтага года зроблена каля 52 тысяч кнігавыдач. Як відаць, амаль кожная кніга пабывала ў чытача. Апрача таго, скарбамі бібліятэкі карыстаюцца звыш 700 завочнікаў. І не было яшчэ выпадку, каб чытач не атрымаў нават самай рэдкай кнігі. Кожны застаецца задаволены, каму даводзіцца бываць у гэтым доме ведаў, як называюць сваю бібліятэку чытачы. Сёлета бібліятэка правяла ўжо 12 культурна - масавых мерапрыемстваў, на якіх пабывала каля сямі тысяч чалавек.

Госць з Туркменіі пазнаёміўся з работай раённай, а таксама многіх сельскіх бібліятэк, прысутнічаў на пасяджэнні савета раённай бібліятэкі, на якім падзяліўся сваімі ўражаннямі аб усім новым, што ўбачыў у беларускіх сяброў. Тут жа, на савеце, у склад якога ўваходзяць 19 актывістаў — савецкіх, партыйных, камсамольскіх работнікаў, чытачоў і пенсіянераў, былі распрацаваны новыя ўмовы сацыялістычнага спаборніцтва ў гонар 50-годдзя Савецкай улады і 100-годдзя з дня нараджэння Ул. І. Леніна.

Днямі Ігар Алексіевіч атрымаў ліст з Туркменіі. Саят Джараеў дзякуе за гасціннасць і за ўсё тое добрае, што ўзяў ён з сабой, каб яшчэ лепш мацаваць дружбу двух братніх народаў.

М. ПАЦЕМКІН.

ВЕЧНА Ў ПАМЯЦІ

# БАЛАДА АБ ДВАЦЦАЦІ СЯМІ

ПА СЛЯДАХ АДНАГО ПОДЗВІГУ

Можна смела сказаць: гэты паэтычны твор—унікальны. Не, не сваім майстэрствам ён вызначаецца, не арыгінальнасцю формы, не мастацкімі сродкамі. Наадварот. «Балада аб дваццаці сямі» — так называецца гэты твор — напісаны не вельмі яшчэ ўпэўненай рукой франтавога паэта Аркадзя Яўсеева. І пры гэтым трэба яшчэ помніць, дзе гэтая балада пісалася, — на пяраднім краі, пад шалёным агнём фашыстаў. І ўсё ж такі, калі мы падкрэсліваем яе унікальнасць, дык маем на ўвазе не гэта, а сам змест твора. А па змесце—ён сапраўды гістарычны дакумент, у якім у паэтычнай форме расказана пра канкрэтны подзвіг, пра подзвіг дваццаці сямі аднапалчан Аркадзя Яўсеева.

Самае цікавае, што пра гэты подзвіг байцы і камандзіры 39-й арміі, дзе ўсё гэта адбывалася, даведаліся ўпершыню іменна з балады, якая была надрукавана 18 студзеня 1944 года ў армейскай газеце «Сын Родины». І потым ужо пра гэты подзвіг было расказана ў шматлікіх лістоўках, газетах, гутарках палітработнікаў.

А цяпер коратка пра падзеі, якія апісаў франтавы паэт.

У канцы 1943 года войскі Заходняга фронту вялі паспяховае наступленне на Віцебск. Ля старажытнага беларускага гарадка Лёзна савецкія воіны сустрэлі лютае супраціўленне фашыстаў. Гэта быў славуты Мядзведжы вал, на які гітлераўцы ўскладалі вялікія спадзяванні.

Падраздзяленні 875-га стралковага палка заляглі ля падножжа Безыменнай вышыні недалёка ад вёскі Каўшыры, прыціснутыя жорсткім агнём гітлераўцаў. Батальёны неслі вялікія страты ў час няспынных атак вышыні, але ўсё беспаспяхова. Неабходна было любымі сродкамі выбіць фашыстаў з пануючай вышыні.

Правесці гэтую аперацыю даручылі роце лейтэнанта-сібірака Івана Яфімавіча Бясхлебнага. Паводле цяперашніх успамінаў некаторых яго аднапалчан усё было так:

Гэта адбылося ўначы на 26 снежня 1943 года. Іх было 27. Смелым і адважным кідком яны ўварваліся ў апорны пункт і выбілі фашыстаў з Безыменнай. Вораг, які пераважаў у сілах, контратакаваў няспынна. Увесь дзень на вышыні кіпеў жорсткі бой. Калі ж увечары 26 снежня полк прарваўся праз заслону артагню і рашучай штыхавой атакай збіў гітлераўцаў, што сям-там прарваліся на вышыню, воіны не знайшлі ў жывых нікога.

Перад новым кідком далей да аўтамагістралі Смаленск — Віцебск, да наступных паясоў Мядзведжага валу, сябры з воінскай пашанаю апусцілі ў магілу героя. Расказваюць, што ў тую ж халодную, завірушную ноч у адным з паўразбураных бліндажоў там, на Безыменнай, схіліўшыся над сваім блакнотам, пры мігатлівым святле газоўкі да самай раніцы сядзеў воін, апрануты ў пракураны парахавым дымам салдацкі шынель... Гэта быў франтавы паэт Аркадзь Яўсееў.

18 студзеня 1944 года палкі і дывізіі, дзесяткі тысяч воінаў 39-й арміі чыталі і завучвалі напамяць строфы гераічнай «Балады аб дваццаці сямі».

Так бились герои на славном
посту.
На землю опустилася темь...
И отстояли в бою высоту
Бессмертные двадцать семь.
Так пусть же, когда мы закончим
маршрут,
Вернемся со славой назад,
Гремит над великой Москвою
салют
В честь этих геройских ребят.

Цяпер, дзякуючы аднаму з тых, хто ў ліхую гадзіну да штыха прыраўняў сваё пяро, мы з вамі ведаем многае пра подзвіг на Безыменнай вышыні. Многае, але яшчэ не ўсё...

Ці ўсе героі загінулі?

Мы падкрэслівалі ўжо дакументальную канкрэтнасць «Балады». Зусім відавочна, што паэт будаваў сюжэт не на аснове сваёй фантазіі або мастацкага домыслу. Прысвячэнне ў баладзе і дэталізацыя асобных эпізодаў бою пацвярджаюць здагадку аб тым, што адзін або некалькі воінаў роты лейтэнанта Бясхлебнага засталіся ў жывых і падрабязна паведамілі Аркадзю Яўсееву пра тыя падзеі, удзельнікамі і відавочцамі якіх яны былі. Вядома, лепш за ўсё было б спытаць пра ўсё гэта ў самога паэта, але, на жаль, і яго сляды зацерліся недзе ў снягах Віцебшчыны.

Шматразовыя і настойлівыя спробы высветліць лёс паэта ні да чога пакуль не прывялі. Паводле атрыманых намі пры садзеянні рэдакцыі «Литературной газеты» і Усесаюзнай цэнтральнай бібліятэкі імя Ул. І. Леніна звестак, публікацыя вершаў паэта-воіна Аркадзя Яўсеева ў цэнтральным друку спынілася ў верасні 1943 года. Такім чынам, «Балада аб дваццаці сямі», відаць, была апошнім творам Аркадзя Яўсеева, які загінуў на фронце ў пачатку 1944 года.

Пошукі працягваліся. Трэба было мець афіцыйныя ваенна-штабныя крыніцы, каб канчаткова праверыць кожную версію...

І вось, нарэшце, дакументы перад намі. Дваццаць сем копій арыгінальных узнагародных лістоў, пакінутых штабам і падпісаных камандзірам 875-га стралковага палка падпалкоўнікам Токаравым 14 студзеня 1944 года... Зусім дакладна—іх было дваццаць сем... Дваццаць шэсць былі прадстаўлены пасмяротна да звання Героя Савецкага Саюза. А дваццаць сёмы? У яго ўзнагародным лісце няма слова «пасмяротна»...

Ён, відаць, і быў тым адзіным гераічным абаронцам Безыменнай вышыні, што застаўся ў жывых і паведаміў пра ўсё Яўсееву. Ім аказаўся кубанскі казак са станіцы Унарокава Яраслаўскага раёна Краснадарскага краю Міхаіл Рыгоравіч Рапукоў. Праверыць гэта не ўдалося, бо высветлілася, што заслужаны баявы ветэран памёр у 1963 годзе ў сябе на радзіме.

Здавалася, што гэтую гераічную старонку гісторыі якімі-небудзь падрабязнасцямі дапоўніць не ўдасца. Аднак пошук працягваўся...

Вясною 1964 года з архіва Міністэрства абароны СССР у Мінск прыйшоў яшчэ адзін дакумент, у якім гаварылася:

«Усе ўдзельнікі подзвігу 26 снежня 1943 года (27 байцоў і камандзіраў), як удалося ўстанавіць, загадам камандзіра 84-га стралковага корпуса № 011/Н ад 26 лютага 1944 года ўзнагароджаны ордэнамі Айчыннай вайны першай ступені. Дакументаў палка, дывізіі і корпуса, па якіх можна было б навесці даведкі, устанавіць, калі і каму ўручаны гэтыя ордэны (і ці ўручаны), на захоўванні няма... Фотакартак узнагароджаных няма...»

Кожны ведае, што ў тыя цяжкія ваенныя гады ўсяляк маглі скласціся акалічнасці, асабліва ў складаны перыяд наступлення... Пісьмы членаў сем'яў загінуўшых на Безыменнай вышыні воінаў, якія прыбывалі ў Мінск адно за адным, сведчылі аб тым, што родным невядомы лёс іх мужоў, бацькоў, братоў, сыноў, не вядома пра іх подзвіг і ўзнагароду. Некаторыя з загінуўшых воінаў лічыліся прапаўшымі без вестак. Між тым статут ордэна Айчыннай вайны прадугледжвае, у выпадку смерці кавалера гэтага ордэна перадачу ўзнагароды бліжэйшым сваякам для вечнага хавання ў сям'і.

Давялося па ўсёй краіне шукаць членаў сем'яў загінуўшых воінаў. У гэтым неацэнную дапамогу аказалі нам органы міліцыі, сельсаветы, райваенкаматы. Многія дзесяткі людзей, даведаўшыся, у чым справа, не пашкадавалі працы, сіл і часу...

І вось аднойчы на адно са шматлікіх запытанняў пра месцазнаходжанне бліжэйшых сваякоў загінуўшага смерцю храбрых салдата Андрэя Якаўлевіча Кабыльчанкі прыбыў адказ намесніка Харольскага РАМ тав. Крачкова, які паведамляў: «...Як устаноўлена праверкай, удзельнік Вялікай Айчыннай вайны не загінуў на фронце, а жывы... Цяпер ён жыве ў сяле Стракачы Пузырэўскага сельсавета Харольскага раёна Палтаўскай вобласці...»

Так шчасліва, літаральна з мёртвых, уваскрэс адзін з герояў Безыменнай вышыні палтаўскі калгаснік А. Я. Кабыльчанка. Сціплы ветэран нават і не падазраваў аб тым, што ўжо больш двух дзесяткаў год пра яго і яго баявых сяброў у народзе складаюцца гераічныя легенды. Нічога не ведаў ён і пра свой высокі баявы ордэн, якім быў узнагароджаны пасмяротна...

...Амаль усё так і было там, на Безыменнай, у тую страшную завірушную ноч. Да 16 гадзін наступнага дня іх, яшчэ здольных трымаць у руках зброю, заставалася толькі трое. Перад апошняй, шостай па ліку контратакай фашыстаў уся вышыня палала ў суцэльным полымі выбухаў снарадаў. Яшчэ жывыя абаронцы Безыменнай былі ўжо па шмат разоў паранены, але працягвалі змагацца... Парторг малодшы лейтэнант Павел Уладзіміраў сяк-так мог рухацца. Каб стварыць уяўленне суцэльнай абароны, ён бясконца манеўраваў па траншэях і хадах зносін, адкрываў агонь з самых розных відаў стралковай зброі.

Байцы-землякі Андрэй Кабыльчанка і Пётр Капінос па загадзе малодшага лейтэнанта з двума трафейнымі ручнымі кулямётамі залягглі на самым небяспечным участку—на левым флангу перад ворагам. Канчаліся патроны. У запасе ўсяго некалькі ручных гранат... «Трымайцеся, таварышы! Зараз падыдуць нашы!»— крыкнуў парторг. Калі гітлераўцы падняліся ў новую атаку, іх у каторы ўжо раз сустрэў знішчальны агонь... Дзіка ўзвыўшы, проста ў траншэю ўпала і гулка разарвалася міна. Ухапіўшыся за бок, смяртэльна паранены ўпаў Капінос. Андрэю Кабыльчанку гарачы асколак трапіў у вока... З усіх бакоў набеглі ворагі, але ён, ледзь трымаючыся на нагах, амаль аслеплы, да канца адбіваўся гранатамі...

Ледзь жывымі схапілі іх фашысты. Навалам, наверх сваіх забітых салдат кінулі ворагі на сані нашых адважных суайчыннікаў і пагналі па снезе коней.

А на самай вяршыні вышыні, ля разбуранага бліндажа, яшчэ грымелі выбухі гранат і раздаваліся аўтаматныя чэргі. Там вёў свой апошні бой парторг Павел Уладзіміраў...

Потым была страшэнна чорная ноч фашысцкага палону. Ад заражэння крыві памёр у лагеры Пётр Паўлавіч Капінос... У 1945 годзе Савецкая Армія прынесла вызваленне. У ваенным шпіталі падлячылі знявечанага ў баях ветэрана і адправілі дадому на родную Палтаўшчыну.

Вось і высветлены, здавалася б, апошнія белыя плямы гэтага гераічнага эпізоду з гісторыі Айчыннай вайны. Аднак у Мінск усё прыходзілі і прыходзілі пісьмы. З іх відаць было, што яшчэ многія героі Безыменнай лічыліся прапаўшымі без весткі. Група мінскіх краязнаўцаў, журналістаў, камсамольцаў — «чырвоных следапытаў» мінскай 40-й сярэдняй школы імя Максіма Багдановіча звярнулася да міністра абароны СССР Маршала Савецкага Саюза Р. Я. Маліноўскага з просьбаю ўручыць сем'ям загінуўшых смерцю храбрых воінаў ордэны Айчыннай вайны I ступені. Просьба была задаволена. А адзінаму ўдзельніку бяспрыкладнага бою на Безыменнай вышыні, які застаўся жывы, А. Я. Кабыльчанку, а таксама жонцы і сыну парторга роты П. Уладзіміраў ордэны былі ўручаны ў Мінску.

Гэта з'явілася своеасаблівым эпілогам да ўсяго, што 23 гады назад расказаў франтавы паэт Аркадзь Яўсееў.

І. КАРШАКЕВІЧ,
Н. АКАЛОВІЧ.

У Гродзенскім музычна-педагагічным вучылішчы існуюць харавы калектыў, аркестр народных інструментаў, ансамбль баяністаў і камерны аркестр. Цяпер гэтыя калектывы рыхтуюцца да канцэртаў, прысвечаных 50-годдзю Вялікага Кастрычніка, з якімі навучэнцы выступяць у раённым Доме культуры, у калгасах і саўгасах, у воінаў Савецкай Арміі.

На здымку: — рэпеціруе камерны аркестр.

Фота М. РУБІНШТЭЙНА.

ТЫДЗЕНЬ ТАДЖЫКСКАЙ ЛІТАРАТУРЫ У БЕЛАРУСІ

# АД СЭРЦА ДА СЭРЦА— САМЫ КАРОТКІ ШЛЯХ

## СЯБРАВАЦЬ—ЗНАЧЫЦЬ ВЕДАЦЬ АДЗІН АДНАГО

У гісторыі развіцця таджыкскага і беларускага кіно многа агульнага. Прыблізна ў адзін і той жа час з'явіліся на экране першыя таджыкскія і беларускія фільмы. Беларускім гледачам добра вядомы таджыкскія фільмы, якія ішлі на нашых экранах,—«Лёс паэта», «Лейлі і Меджнун», «Я сустрэў дзяўчыну», «Дзеці Паміра», «Зумрад», «Сцяг кавалера», «Чалавек мяняе скуру» і іншыя.

Карэспандэнт газеты «Літаратура і мастацтва» сустрэўся з работнікамі таджыкскага кіно, якія прыехалі ў Беларусь на Тыдзень таджыкскай літаратуры.

— Мінскія гледачы ў час фестывалю, —сказаў галоўны рэдактар кінастудыі «Таджыкфільм» М. Муладжанаў, — убачаць новую таджыкскую сатырычную камедыю «12 магіл Хаджы Насрэдзіна». Мы наогул вялікую ўвагу ўдзяляем камедыі. Гэта жанр, які асабліва любяць гледачы. Мы збіраемся выпускаць адну-дзве камедыі штогод.

М. Муладжанаў расказвае далей, што студыя вялікую ўвагу аддае займальнасці карцін.

— Мы лічым, — працягвае ён, — што нам патрэбны фільмы, на якія гледачы хадзілі б па некалькі разоў. Мы павінны даць ім у прыклад герояў, падобных на Чапаева, Чарчагіна, герояў, не адарваных ад мас, а звязаных з імі.

На студыі «Таджыкфільм» ужо цяпер ёсць сцэнарыі па 1970 год уключна. Сярод іх такія, як пра Амара Хаяма—паэта, матэматыка, астранома, чалавека, які зрабіў лепшы каляндар свету. Пісьменнік Джалал Ікрамі напісаў сцэнарый па свайму раману «Дачка агню». Рэжысёр Т. Сабураў ужо ставіць яго. Абмяркоўваюцца планы сумеснай савецка-афганскай пастаноўкі аб народна-вызваленчым руху ў капіталістычных краінах.

Тэма пранікнення ленінскіх ідэй у масы хвалюе дзеячоў і беларускага, і таджыкскага кіно. Штосьці агульнае ёсць, напрыклад, у таджыкскім фільме «Дзеці Паміра» і беларускім, што зараз ставіцца, — «Да Леніна». Народны паэт Таджыкістана Мірсаід Міршакар напісаў сцэнарый па сваёй паэме «Ленін на Паміры». Фільм гэты—паэтычны твор аб ідэях Леніна, што праніклі ў далёкі і суровы край.

Размова аб праблемах таджыкскага і беларускага кіно працягваецца з рэжысёрам Б. Кімягаравым. Народны артыст рэспублікі, ён працуе ў кіно ўжо дванаццаць год. Ён—аўтар шэрага сцэнарыяў, аўтар каля 20 дакументальных карцін і такіх вядомых мастацкіх фільмаў, як «Дахунда» (па матывах рамана С. Айні), «Лёс паэта» (аб пачынальніку таджыкска - персідскай літаратуры Рудакі), «Мірны час», «Хасан-Арбакеш» і інш.

За час свайго знаходжання ў Беларусі Б. Кімягараў разам з іншымі дзеячамі кіно прагледзеў даволі многа беларускіх фільмаў.

— Мяне ўзрадавала і ўсхвалявала, — кажа Б. Кімягараў, — што на «Беларусьфільме» столькі таленавітай моладзі: В. Тураў, Б. Сцяпанаў, Ул. Бычкоў, В. Вінаградаў, І. Дабралюбаў і іншыя. Іх творы я глядзеў з вялікай увагай. Найбольш спадабаліся мне фільмы В. Турава.

Размаўляем аб рабоце пісьменніка ў кіно. Многія фільмы Б. Кімягарава пастаўлены па вядомых літаратурных творах С. Улуг-задэ, М. Турсун-задэ, В. Хабура.

— Да працы літаратара ў кінематаграфіі, — кажа рэжысёр, — я адношуся з вялікай павагай. Я бачыў усе фільмы, пастаўленыя ў вас па творах Васіля Быкава. Гэта цудоўны пісьменнік, я люблю яго кнігі і радуюся, што ваша кіно трымае з ім цесную сувязь. Калі я бачу на экране, як пакутавала Беларусь у часы вайны, якіх герояў яна нараджала, я глыбока хвалююся. Я бачыў ваш дакументальны фільм «Вызваленне Савецкай Беларусі»—сведчанне вялікай чалавечай мужнасці. Я і дзецям сваім кажу: «Стой, пакланіся: ідзе беларус!» Толькі тут, пабачыўшы вашы фільмы, праехаўшы па месцах баявой славы, я ў поўнай меры ўсвядоміў усё вялізнае значэнне гераізму беларускага народа ў часы вайны.

Спадабаліся Б. Кімягараву і нашы дакументальныя фільмы, у якіх расказваецца аб сучаснасці, — «Ёсць такая зямля», «Бацька Нёман», «Вясновыя галасы» і іншыя. У свой час рэжысёр сам паставіў каляровы дакументальны фільм «Чатыры песні аб Таджыкістане». Паглядзеўшы фільмы аб прыродзе Беларусі, таджыкскі рэжысёр сказаў:

— Я ў захапленні. Не падумайце, што я кажу толькі як госць, гэта сапраўды так. Такія краявіды, такія рэкі, лясы, палі—гэта цудоўна. Беларускім кінематаграфістам ёсць што здымаць.

І ў таджыкскага, і ў беларускага кіно многа агульных праблем, клопатаў, задач. І самае галоўнае для абедзвюх кінематаграфій—ствараць фільмы, якія б даходзілі да сэрца і свядомасці гледача. Ёсць надзея, што творчыя сустрэчы будуць садзейнічаць узаемнаму ўзбагачэнню таджыкскіх і беларускіх кінематаграфістаў, яшчэ больш умацуюць дружбу нашых народаў.

У мінскім кінатэатры «Піянер» адбылося ўрачыстае адкрыццё фестывалю фільмаў Таджыкістана. У час адкрыцця заслужаны дзеяч мастацтваў БССР аператар Уладзімір Цяслюк (злева) сустрэўся з аператарам, заслужаным дзеячом мастацтваў Таджыкскай ССР, лаўрэатам Дзяржаўнай прэміі Ібрагімам Барамыкавым.

Фота Ул. ЛУПЕЙКІ (БЕЛТА).

## Спявае Хікмат Рызо

Ноч была зорная і цёплая. Толькі пад раніцу вецер прынёс у даліну бадзёрую прахалоду з вечна заснежаных вяршынь Гісарскага хрыбта. Але калгаснікі, што сядзелі ў садзе, не заўважылі, што прайшла ўжо ноч, што ўстала ружовае сонца.

Спяваў хафіз Хікмат Рызо. Спяваў усю ноч, сціхаючы на некалькі хвілін, каб глынуць з піялы моцнага зялёнага чаю. Ён спяваў песні шчыра і з натхненнем, спяваў пра свой Таджыкістан, пра людзей. Песні і сказы Хікмата Рызо простыя і выразныя, вершы лірычныя і музычныя.

Я шмат разоў слухаў Хікмата Рызо, запісваў з яго слоў песні і перакладаў іх на рускую мову. Яркія вобразы эпасу, цудоўны стыль, паэтычнасць, спалучаючыся з моцным голасам спевака пад акампанемент дутара, робяць моцнае ўражанне.

У Хікмата Рызо прыемны тэмбр голасу, надзвычайная артыстычнасць і талент імправізатара. Указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета Таджыкскай ССР калгаснику Хікмату Рызо за выканаўчую дзейнасць і шырокую папулярызацыю таджыкскага фальклору і, у прыватнасці, гераічнага эпасу «Гуруглі», прысвоена ганаровае званне народнага песняра — хафіза.

Складаны жыццёвы шлях таленавітага казачніка. Хікмат Рызо нарадзіўся ў сям'і горца—майстра музычных інструментаў Рызо Пірмухамедава. Бацька памёр, калі хлопчыку споўніўся год. Уся сям'я разбрылася ў пошуках кавалка хлеба. Маці Рызо нанялася ў служанкі да бая.

З кішлака ў кішлак хадзіў падлетак босы, галодны, памагаючы маці здабываць на пражыццё. Першыя песні юнага паэта адлюстроўвалі жыццё беззямельнага дэхканіна, забітага, галоднага, прыгнечанага. Ён жыве ў дзіравай кібітцы, і дні падобныя адзін на другі, як панурыя голыя скалы.

Каб вывучыць тэкст, авалодаць майстэрствам выконваць таджыкскі эпас «Гуруглі», Хікмату яшчэ ў юнацтве спатрэбілася пяць год. За гэты час хафіз засвоіў больш пяцідзесяці дастанаў. Гэта нялёгка. Бо мелодыі пастаянна мяняюцца ў працэсе выканання ў залежнасці ад характару адлюстроўваемых падзей.

Хікмат Рызо стварыў у нейкай меры сваю версію эпасу, ён пасвойму трактуе «Гуруглі»—старажытную народную легенду, якая адлюстроўвае мару аб шчаслівым жыцці простых людзей у райскім горадзе Чамбуле.

Эпас «Гуруглі» ўслаўляе подзвігі Гуруглі і яго сыноў, іх гераічную барацьбу са шматлікімі ворагамі за шчасце і росквіт Чамбула. Гэта больш 50 дастанаў-песень. Кожны дастан мае не менш дзвюх-трох тысяч радкоў, а ўвесь эпас—сто дваццаць тысяч радкоў.

Выступаючы перад людзьмі з выкананнем эпасу «Гуруглі», хафіз перапыняў яго адступленнямі аб злых баях і ашуканцах-мулах. За гэта паэта збівалі, пагражалі адправіць у падзямелле. Але Хікмат Рызо па-ранейшаму спяваў для сялян.

Вялікі ўплыў на творчасць Хікмата аказала яго знаёмства з таджыкамі-горцамі, рабочымі-адыходнікамі, якія вярталіся пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі з Самарканда, Ташкента, Каканда, Хаджэнта і іншых прамысловых гарадоў Сярэдняй Азіі. Ад іх ён даведаўся пра рускую рэвалюцыю, пра Савецкую ўладу. Паэт стаў актыўна змагацца за ўстанаўленне новага жыцця.

Яго песні загучалі палітычна востра.

...Вялікай падзеяй у жыцці Хікмата з'явілася паездка на Дэкаду таджыкскай літаратуры ў Маскве. Ён выступаў перад працоўнымі сталіцы па Маскоўскім радыё і тэлебачанні.

Удзельнікі XV Міжнароднага кангрэсу ўсходазнаўцаў у Маскве сустрэлі авацыямі хафіза, калі ён выконваў урывак з «Гуруглі».

У сваіх песнях Хікмат Рызо часта параўноўвае мінулае і сённяшні дзень роднага краю. Ён паказвае дасягненні Таджыкістана — былой вотчыны эміра, якая стала краінай фабрык, заводаў, калгасаў, вышэйшых навучальных устаноў, краінай вольных людзей.

Цяпер у Таджыкістане больш дзвюхсот спевакоў-імправізатараў —старых і маладых. І сярод гэтых таленавітых людзей ганаровае месца займае любімец народа — Хікмат Рызо.

Якаў НАЛЬСКІ (АДН).

Гафар МІРЗОЕЎ

## СКАЗ АБ ЖЫВОЙ ВАДЗЕ

Вялікі ўладыка зямлі і нябёс
Быў, кажуць, раней
прастаком у кароне.
Не будзь ён такім—
чалавечы наш лёс
Не даручыў бы ён нейкай вароне.

Было гэта так:
захацеў бог людзям
Зрабіць падарунак да новага году.
І што ён прыдумаў?
Даць ёлку дзяцям,
Бяссмерце — ўсяму чалавечаму роду.

Сапеў і крактаў гасподзь усю ноч,
І ўрэшце стварыў ён ваду жывую.
Ён выйшаў. Нікога не ўбачыў, апроч
Адной нейкай птушкі,—давай, пазаву я.

Ды дзіўная нейкая птушка была!
Была яна брудная, неахайная,
Спяваць не умела, свістаць не магла,
Хіба што каркнула толькі, нахабная!

Дзівіўся гасподзь,
не дзівіцца не мог:
— Здаецца, такую і не ствараў я!
Калі ж і стварыў,
то які я бог,
Якое ўменне маё і старанне!

І ўсё ж бог даверыў вароне той
(ён сам быў варонай трохі)
Людзей акрапіць жывою вадой, —
Казе баязлівай даў рогі.

Варона ж уцяміла толькі адно:
«Ого! Я — абранніца бога!»
Крычала, кулялася ажно,
З'ехала з глузду, нябога.

Села на елку яна адпачыць.
Тут міма дзве птушкі пралятаў.
Варона ад злосці ледзь не крычыць —
Чаму яе птушкі не прывітаў.

Дзе іх увага, павага, пашана іх?!
Мне ж бог даручыў пасаду арліную!
І каркнула так,
што ў той жа міг
Пралілася жывая вада на яліну.

Вось такім чынам
і стала тады
Елка-яліна вечназялёнай.
А людзі не маюць
жывой вады
З-за бога-разявы і дрэні-вароны.

Пераклаў з таджыкскай Анатоль ВЯРЦІНСКІ.

Сустрэча сяброў... Таджыкскім пісьменнікам Мухідзіну Фархату і Абдуджабору Кахары ёсць аб чым пагаварыць са сваім беларускім калегам Тарасам Хадкевічам: у грозныя гады Вялікай Айчыннай вайны ім давялося са зброяй у руках прайсці па многіх дарогах Беларусі, вызваляючы нашу рэспубліку ад фашысцкіх захопнікаў.

На здымку — Мухідзін Фархат, Абдуджабор Кахары гутараць з Тарасам Хадкевічам.

*Я веру ў маладосць: яна*
*такая—*
*Калі паклічаш — хутка*
*адгукнецца.*
*Хай маладосць жыве і не*
*сціхае*
*Ў жыцці і вершах, у*
*нястомных сэрцах!*

Эдзі АГНЯЦВЕТ.

Сёння спаўняецца 50 год Эдзі Агняцвет. Праўленне Саюза пісьменнікаў Беларусі звярнулася да яе з прывітаннем, у якім гаворыцца:

«Дарагая Эдзі Сямёнаўна!

У дзень Вашага 50-годдзя сардэчна вітаем і горача віншуем Вас, таленавітую, папулярную нашу паэтэсу, чулага, добрага чалавека, са слаўным юбілеем.

Ваша плённая літаратурная праца, якая пачалася з першых юнацкіх год, значна ўзбагаціла добрыя старонкі нашай паэзіі і дзіцячай літаратуры. Шмат якія Вашы кнігі зрабіліся шчырымі сябрамі піянераў, школьнікаў, а некаторыя песні, напісаныя на Вашы тэксты, папулярнымі ў нашай рэспубліцы і за яе межамі. Вялікую справу Вы зрабілі і робіце ў галіне прапаганды беларускай літаратуры і эстэтычнага выхавання школьнікаў. Мы карыстаемся выпадкам, каб сёння за ўсё яшчэ раз падзякаваць Вам.

Жадаем Вам, дарагая Эдзі Сямёнаўна, вялікага шчасця, добрага здароўя, новых творчых поспехаў на ніве нашай літаратуры».

Рэдакцыя «Літаратуры і мастацтва» далучаецца да віншавання і жадае Эдзі Сямёнаўне новых поспехаў, шчасця і творчага неспакою.

## З ВЕРАЮ Ў МАЛАДОСЦЬ

Прыемна пачынаць гаворку пра жанчыну слаўным словам «маладосць»! Тым больш прыемна, што жанчына гэтая, як кажуць, ва ўзросце і што яна—паэтэса, яе радкі пастаўлены эпіграфам да артыкула...

Прыемна гаварыць пра чалавека, якога ведаеш даўно, з якім па-сяброўску сустракаешся на розных паваротах жыцця, раішся з ім.

Калі пачаўся шлях Эдзі Агняцвет у літаратуру? Усё пачалося ў пару юнацтва — у пару першых піянерскіх атрадаў і камсамольскіх ячэек, першых вершаў, народжаных чыстым пачуццём і складзеных на мове, адроджанай да жыцця Вялікім Кастрычнікам.

Не ведаю, як выглядала тады Эдзі Агняцвет, мабыць, вельмі хораша, бо помню такі ўспамін Уладзіславы Францаўны Луцэвіч: «І Эдзя, як пачынала, да Янкі прыйшла аднойчы, вершы прынесла... Такая рослая, з доўгай касой, а на вуліцы малады чалавек чакае...» Відаць, і Купалу дзяўчына тая з доўгай касой спадабалася, бо кажуць, што гэта ён прыдумаў ёй такі яркі псеўданім...

Вучоба, праца, творчыя сходы і спрэчкі, сустрэчы з выдатнымі майстрамі беларускай літаратуры — гэта на пачатку, на шчаслівым паэтычным пачатку. Першая кніжка вершаў «Маё пакаленне» выйшла з друку, калі паэтэсе было ўсяго дзевятнаццаць год...

А ў сорак першым, крыху сталейшай, яна жыла ўжо ў Ташкенце, перажыўшы гаротнае развітанне з бацькаўшчынай, з братам Барысам, якога сям'я так і не дачакалася з фронту...

У Ташкенце захварэла. Хворую наведаў Якуб Колас. Паглядзеў на панылыя голыя сцены, на голы стол, задумаўся, а на развітанне падарыў гаспадыні свой тоненькі ваенны зборнік. На старонцы напісана: «Мілай Эдзі на памяць чэзлая кніжачка, як і наша ташкенцкае жыццё...»

Ташкент у «чэзласці» не вінават, вядома, Узбекістан заўсёды ў сэрцы паэтэсы, узбекскаму народу Э. Агняцвет падарыла нямала радкоў удзячнасці. Вінавата была вайна.

Я гляджу на фотакартку ваеннай пары: схуднелы твар, тужлівы позірк выразных чорных вачэй...

Беларусь, даражэнькая маці,
Ты ўстаеш ля мяне па начах.
Як люблю я твае сенажаці
І сасонак струменісты пах!

Я чытаю: «Беларусь — даражэнькая маці» і гатова заплакаць, і цалкам дарую паэтэсе ўсё тое, што часам не задавальняе мяне ў яе творах...

Свой боль і смутак па роднай зямлі, сваю нянавісць да фашыстаў-захопнікаў паэтэса выказвала ў суровых строфах:

Усё звяры спалілі—хату каля
ўзгорка,
Кут мой, дзе расла я, і зялёны
клён.
Так! Не раз употай мы
затужым горка...
Пераль'ём у кулі помсту,
Лолахон!

Сэрца клікала да помсты, да барацьбы. Як і яе сябры, паэтэса змагалася, а зброяй было, безумоўна, слова. Гады вайны значна адтачылі паэтычнае слова беларускай паэтэсы, надалі яму вагі, якой, мажліва, бракавала яшчэ ў творах мірнай — юнацкай пары. Яна піша вершы з канкрэтным адрасам — «Другу на фронт». Піша лібрэта дзіцячай оперы-казкі «Джанат», услаўляючы братэрскую дружбу, мужнасць і вернасць. Яна робіцца актыўным шэфам вайсковых часцей Сярэдне-Азіяцкай Ваеннай Акругі. Захаваліся запісныя кніжкі 1941, 1942, 1943 гадоў... На іх пажоўклых старонках — запісы: «Шпіталь каля тэкстыльнага камбіната». «Шпіталь імя Сямашкі», «Ваенны перасыльны пункт», «Інтэнданцкая акадэмія», «Авіягарадок», «Сустрэча з выхаванцамі дзіцячага дома» і г. д. Эдзі Агняцвет, адна ці разам з узбекскімі калегамі, хадзіла на сустрэчы з раненымі ў шпіталі, чытала вершы байцам, што адпраўляліся на фронт («Іа спякотных завулках хадзілі ў шпіталі мы, на вакзалах чыталі мы вершы байцам...»). Сустракаліся, расчуленыя родным словам, землякі. Некаторыя з герояў вайны рабіліся героямі твораў паэтэсы.

У Ташкенце Эдзі Агняцвет выдае кніжачку вершаў для малых—«Міхасёк». Выданне паслужыла штуршком да працы ў новым кірунку, і той кірунак, як выявілася пасля, стаў галоўным у творчасці паэтэсы. Эдзі Агняцвет — вядомая не толькі ў Беларусі пяснярка племені юных. «Дзецям павінна свяціць яснае, добрае сонца! — кажа паэтэса. — Каб ніколі не будзіла іх выццё сірэны, каб не хадзілі яны сіротамі па ваенных дарогах ...»

І ўсе лепшыя рысы сваёй «дарослай» паэзіі — ідэйную мэтанакіраванасць, патрыятычнасць, прастату, — усё лепшае Эдзі Агняцвет перанесла ў вершы для дзяцей. Паэтэса ўдала ўхіляецца драбнатэм'я, сюсюкання, якое так часта псуе творы для дзяцей. Праўдзівасць, якая мяжуе з дакументальнасцю, вызначае і лепшыя лірычныя цыклы, і лепшыя творы для дзяцей і падлеткаў. Тут можна назваць, напрыклад, верш «Быліна», цыклы «Рэха далёкіх вандровак» і «Узбекскія матывы», паэму «Песня пра піянерскі сцяг» і іншыя.

Праспяваўшы развітальную песню «залатому узбекскаму небу», паэтэса разам з усімі, хто прагнуў сустрэчы з радзімай, вяртаецца ў разбураны, спалены родны Мінск...

Птушкі, здаецца, вітаюцца
уранку:
— Дзень добры, мінчанка!

Яе найпершай песняй на радзіме была песня пра будаўнікоў — учарашніх салдат, партызан і партызанак. Э. Агняцвет узялася за паэму пра будаўнікоў. Ва ўступе да паэмы «Дарога ў будучычню» гучыць бадзёры голас веры ў стваральныя сілы народа:

Тут вырастуць цуды з бетону
і сталі,
Тут людзі, як творцы-асілкі.
паўсталі,
Працуюць пад ветрам яны.
пад дажджом—
Няхай!
Дажывём
Да лепшай часіны, да светлых
палацаў...

Самаадданыя прарабы і цесляі, харошыя дзяўчаты-муляры, творцы новых праспектаў і вуліц, машын і станкоў — імі населены многія старонкі пасляваенных зборнікаў Эдзі Агняцвет.

Усе лепшыя творы паэтэсы народжаны жыццём, яна ўмее трымаць руку на пульсе яго. Сувязь з жыццём — гэта і сувязь з юнымі героямі кніг, якія цэлымі атрадамі наведваюць паэтэсу і з якімі нязменна яна сябруе, гэта і ў час пададзены голас у абарону міру, і таварыская дапамога маладому аўтару. Эдзі Агняцвет многа перакладае, падарожнічае. Але нішто не адцягвае яе турбот аб радку. Яна піша вершы, песні, паэмы. У яе ёсць свае тэмы, свая ніва, аб якой паэтэса дбайна клапоціцца.

Чытаючы кніжкі апошніх гадоў («Беларуская рабіна», «Лірыка»), пераконваешся, наколькі плённым быў шлях ад перадваенных камсамольскіх напеваў да сталага паэтычнага слова. Гэта быў, як мне здаецца, шлях ад фіксавання тэмы да глыбейшай яе распрацоўкі, ад вызначэння пачуцця да поўнага паказу яго ў вершы, ад рыторыкі да цеплыні звычайнага, бытавога слова. У зборніку выбраных твораў «Круглы год» багата вершаў, што пацвярджаюць гэтую думку. Тут гучаць матывы вясновай зямлі, чалавечай дабраты і прыгажосці, шчырых жаночых пачуццяў, якія раней неяк не траплялі ў кола пільнага погляду паэтэсы. Вершы гучаць мілагучна і проста, і гэтая акалічнасць заўважана кампазітарамі, яны шчодра пішуць музыку на вершы Агняцвет.

Я веру ў маладосць: яна
такая —
Калі паклічаш — хутка
адгукнецца...

І я веру ў маладосць паэтэсы, якая прайшла праз выпрабаванні часу і захавалася ў баявых і шчырых вершах. Веру ў гуманнасць помыслаў чалавека, які большую частку свайго жыцця аддае працы для дзяцей — кволай і дужай надзеі чалавецтва.

Свайго лепшага верша, сябры,
я дагэтуль не склала,—

тым часам прызнаецца паэтэса...

Я веру, што «лепшы верш» будзе складзены!

Еўдакія ЛОСЬ.

## КЛУБЫ НА КОЛАХ

Сем вагон-клубаў рэгулярна курсіруюць па Беларускай чыгунцы. Іх паслугамі карыстаюцца больш за сто тысяч чыгуначнікаў і членаў іх сем'яў, працаўнікоў бліжэйшых калгасаў і саўгасаў. Шмат карыснага, цікавага знаходзяць яны ў клубах на колах.

Вагон-клубы беларускіх чыгуначнікаў вядуць прапаганду рэвалюцыйных, баявых і працоўных традыцый савецкага народа, матэрыялаў XXIII з'езда КПСС.

Утульна ў вагон-клубе Віцебскага аддзялення чыгункі. Тут абноўлена наглядная агітацыя. Яна прысвечана падрыхтоўцы да слаўнага 50-годдзя Кастрычніка і 100-годдзя з дня нараджэння Ул. І. Леніна. Маляўнічча афармлены стэнды і фотаальбомы пра слаўны шлях, пройдзены нашай краінай, пра пяцігодкі і канкрэтныя задачы віцебскіх чыгуначнікаў.

У клубе на колах чытаюцца лекцыі і даклады, праводзяцца тэматычныя вечары і сустрэчы з ветэранамі рэвалюцыі, вайны і працы. Цікава прайшла сустрэча з удзельнікамі рэвалюцыйных і баявых падзей, а таксама сустрэча маладых чыгуначнікаў станцыі Обаль з удзельнікамі падпольнай арганізацыі, якая тут дзейнічала ў суровыя гады Вялікай Айчыннай вайны. Актыўна прайшло абмеркаванне кінафільма «Ленін у 1918 годзе». Калектыўны прагляд і абмеркаванне гэтага фільма праведзены на радзе станцый.

У вагон-клубе выдаецца светлагукавая газета. У ёй адлюстроўваюцца працоўныя поспехі віцебскіх чыгуначнікаў у гонар 50-годдзя Вялікага Кастрычніка, прапагандуецца вопыт наватараў, крытыкуюцца тыя, хто парушае працоўную дысцыпліну і грамадскі парадак.

Разнастайная работа па падрыхтоўцы да знамянальнай даты праводзіцца і ў іншых вагон-клубах.

У вагон-клубе Брэсцкага аддзялення рэгулярна чытаюцца лекцыі аб міжнародным становішчы, арганізоўваюцца сустрэчы з работнікамі міліцыі і пагранічнікамі.

Добрую ініцыятыву праявіў загадчык вагон-клуба Гомельскага аддзялення А. Крыштафовіч. Перад адпраўленнем у рэйс ён бярэ з сабою палітычную, тэхнічную, мастацкую літаратуру, прадае яе чыгуначнікам. Асабліва вялікім попытам карыстаецца дзіцячая літаратура. Часта з вагон-клубам выязджаюць настаўнікі. Яны праводзяць гутаркі з дзецьмі, цікавяцца іх вучобай і паводзінамі, арганізоўваецца калектыўнае абмеркаванне асобных мастацкіх твораў.

Р. СЫРКІН.

Аміндзон ШУКУХІ

## З лірычных апавяданняў

### ДВА АРКУШЫ ПАПЕРЫ

Два чыстыя, белыя аркушы паперы ляжалі побач і думалі пра сваю будучыню. Адзін гаварыў:

— На мне напішуць пісьмо да каханай. Дзякуючы мне, зблізяцца два сэрцы, з маёй дапамогай злучацца закаханыя.

Другі сказаў:

— На мне вучоны вырашыць важную навуковую праблему. Мяне будуць хаваць, як помнік, у музеі вечнасці.

Абодва аркушы былі задаволены. Яны чакалі, калі на іх тое напішуць. І гэты дзень, нарэшце, настаў. Двое людзей узялі па аркушу і пайшлі ў розныя канцы горада.

На першым аркушы нейкі благі чалавек, які палічыў за лепшае схавацца за выдуманым прозвішчам, напісаў паклёпніцкую заяву на добрага чалавека. Што мог зрабіць звычайны аркуш паперы?! Ён не мог ні крычаць, ні нават уздыхнуць.

А на другім аркушы добры чалавек быў вымушаны абвяргаць паклёп падлюгі.

Праз некаторы час абодва аркушы зноў сышліся ў адным месцы і, успомніўшы свае светлыя мары, якія, на жаль, ушчэнт разляцеліся, з абурэннем шамацелі. Яны шкадавалі, што цяпер для таго каб даказаць тыя словы, якія напісаны на іх, будзе спісана яшчэ нямала паперы. І яны зайздросцілі лёсу вучнёўскага сшытка, звычайнага сшытка вучня першага класа.

### КВЕТКІ ЛЯ ПАДНОЖЖА ПОМНІКА

Герою, які загінуў на вайне, паставілі ў родным сяле помнік. Урачыстае адкрыццё помніка адбылося 23 лютага — у Дзень Савецкай Арміі.

Яшчэ была зіма. Сыпаў снег. Піянеры паклалі да падножжа помніка яркія кветкі. Кветкі былі штучныя, піянеры зрабілі іх з паперы. Жывых кветак у вёсцы ў гэту лютую зімовую завіруху не было.

Але жывыя кветкі з'явіліся ля падножжа помніка раніцаю наступнага дня. Людзі здзівіліся: адкуль яны ўзяліся, хто іх прынёс?.. А сціплы букет, які палаў фарбамі вясны, з'явіўся і на другую раніцу, і на трэцюю... І цяпер гаворка пра жывыя кветкі пачала маланкаю перадавацца з вуснаў у вусны. І адзін стары па імені Максум з глыбакадумным выглядам дасведчанага расказваў у чайхане.

— Я, — гаварыў ён, — сваімі вачыма бачыў, як прыблізна гадзін у пяць раніцы спусціліся з нябёсаў два божыя анёлы, асвятлілі ўсё навакольле бляскам сваіх ззяючых вачэй, а потым адзін з іх узяў у рукі сухую галінку і малітваю сваёй ператварыў яе ў букет жывых кветак. Анёлы ўсклалі кветкі да падножжа помніка і зноў паляцелі на неба. Выходзіць, што наш герой быў святым чалавекам, і цяпер гэта месца стала святым.

Так сказаў набожны Максум, але яму запярэчыў вартаўнік сельскага магазіна, яснавокі стары па імені Закір-тахо[1]).

— Максум гаворыць праўду, — сказаў, усміхнуўшыся, ён. — Наш герой быў сапраўды святым чалавекам, і месца, дзе мы паставілі яму помнік, стала свяшчэнным для нас. Але наконт анёлаў Максум трошкі памыліўся. Па-першае, анёлаў было не два, а адзін. Па-другое, анёл не спускаўся з нябёсаў, а прыехаў з горада на таксі. І, па-трэцяе, ён не стварыў кветкі з сухой галінкі, а прывёз іх з сабою.

Прысутныя засмяяліся. Максум, не сказаўшы ні слова, пакінуў чайхану.

Раніцаю 8 сакавіка ля падножжа помніка, як і ва ўсе папярэднія дні, зноў аказаліся кветкі. На белым лісточку са сшытка, прышпіленым да букета, ззялі ў промнях веснавога сонца такія радкі:

«У гэты дзень ты заўсёды прыносіў мне кветкі і ўсміхаўся. Цяпер я прыношу табе кветкі і праліваю слёзы».

Гэта былі радкі са сказа аб сумным каханні.

### ІХ БЫЛО ДВОЕ

Іх было двое, і ішлі яны ў розныя бакі. Лёгкі і ласкавы вячэрні ветрык, што нёс на сваіх крылах ап'яняючы водар квітнеючага калгаснага саду, шапаценнем лістоты маладых таполяў ля дарогі шаптаў.

— Не адыходзь, пачакай! Абярніся хаця б, азірніся. Вясна — пара кахання і спадзявання. Калі не верыш мне, — спытай вунь у таго магутнага чынара, што ўзвышаецца ў пачатку дарогі.

І тут жа закалыхаліся і зашапацелі зялёныя галінкі магутнага чынара, шапаценнем сваім быццам пацвярджаючы ласкавы шэпт вячэрняга ветрыка. Але загаварыла славалюбная Гордасць, усёй сваёй славалюбнай істотай адштурхнула ветрык і сказала юнаку:

— Не слухай кожнага! Не трэба вагацца! Ідзі сваёй дарогай! Калі яна кахае цябе, дык сама пабяжыць за табою.

Юнак паслухаў славалюбную Гордасць, бо ён быў яшчэ занадта юны.

Іх было двое, і ішлі яны ў розныя бакі.

Вада ў ручаі, што імчала ўздоўж бязлюднай алеі, цурчанням сваім гаварыла:

— Не ідзі, пачакай! Абярніся хаця б, азірніся. Ружу таксама цалуюць. Зоркі імкнуцца да збліжэння. Каханне чыстае, як ясны вечар. На каханага нельга злавацца. Калі не верыш мне, — спытай у салодкагалосых салаўёў.

І тут жа пачуўся саладкагучны пошчак салаўёў, запелі яны, песняй сваёй быццам пацвярджаючы праўду вады, якая цурчыць. Дзяўчына была спынілася, але загаварыла Гордасць, усёй сваёй славалюбнай істотай заглушыла цурчанне ручая і песню салаўёў і сказала дзяўчыне:

— Не слухай кожнага! Не трэба вагацца! Ідзі сваёй дарогай. Калі ён кахае цябе, дык сам пабяжыць за табою.

Дзяўчына паверыла славалюбнай Гордасці, бо яна была яшчэ занадта юная.

Іх было двое, і ішлі яны ў розныя бакі.

Галінкі ніцай вярбы, прызнаваючы ў народзе дрэвам Меджнуна[1]), схіліўшыся да самай зямлі, гаварылі:

— Пачакай, не ідзі! Азірніся назад! Вярніся да яе, скажы: «Даруй мне, родная!», і ўсё навокал зацвіце, свет здасца табе гулістанам[2]). Няўжо ты не можаш дараваць капрызаў каханай? Павер нам, мы гаварылі праўду. А калі не верыш, — спытай у птушак, якія абвяшчаюць світанне.

І птушкі, якія абвяшчаюць світанне, залапаталі крыламі, закрычалі на ўсё сваё птушынае горла, крыкам сваім нібы пацвярджаючы словы ніцай вярбы. Юнак быў спыніўся, але загаварыла Гордасць, усёй сваёй славалюбнай істотай люта абламала галінкі дрэва Меджнуна і сказала юнаку:

— Не слухай кожнага! Не будзь нерашучым! З дарогі збочвае толькі слабы. А ты ж мужчына! Няўжо будзеш кланяцца дзяўчыне? Калі яна цябе кахае, дык сама павінна ісці за табою.

І зноў юнак паслухаў славалюбную Гордасць, бо ён быў яшчэ занадта юны.

Іх было двое, і ішлі яны ў розныя бакі.

Пахучая вострая мята, што слалася пяшчотнай шаўковай траўкай і чаплялася за лёгкую сінюю сукенку, расхвалявалася.

— Стой, пачакай! Азірніся назад! Аклікні свайго суджанага — ён прыляціць да цябе, як на крылах. Вада заўсёды вяртаецца ў свае берагі. Калі не верыш нам, — спытай у начных жучкоў-светлячкоў.

І тут жа начныя жучкі-светлячкі зараіліся, іскрамі ўспыхнулі ў цемры, свячэннем сваім быццам бы пацвярджаючы праўду вострапахучай мяты. Але загаварыла Гордасць, усёй сваёй славалюбнай істотай святло светлячкоў пагасіла і сказала дзяўчыне:

— Не слухай кожнага! Ніколі не трэба вагацца! Беражы свой гонар! Якая дзяўчына першай прызнаецца мужчыну? Калі ён кахае цябе, дык сам павінен прыйсці да цябе.

І зноў дзяўчына паверыла славалюбнай Гордасці, бо яна была яшчэ зусім юная.

Іх было двое, і ішлі яны ў розныя бакі.

Калі яны будуць так ісці, дык калі-небудзь зноў сустрэнуцца. Павінны сустрэцца. Бо зямля наша круглая. Але хіба не будзе тады позна? Яны абодва падумалі пра гэта. І як толькі пранізала іх гэтая думка, у той жа момант у зорным перадсвітальным небе з'явіліся дзве касмічныя ракеты, што ляцелі насустрач адна адной.

Юнак і дзяўчына, праводзячы іх задуменным позіркам, азірнуліся — і таксама ўбачылі адно аднаго.

Дзве нябесныя зоркі і дзве зямныя пачалі паволі збліжацца.

Каханне перамагло, славалюбная Гордасць адступіла. Пара ўзмужнення юнацтва разгарнула сваю першую старонку.

Пераклад з таджыкскай.

[1]) Тахо — дзядзька.

[1]) Меджнун — закаханы.
[2]) Гулістан — сад ружаў, кветнік.

# ПОЛЬСКАЯ ПАЭМА «УЛЬЯНАЎ»

Ва Ульянаўск прыйшла пасылка з Польшчы. У ёй быў падрадкоўны пераклад паэмы «Ульянаў». Паэма была апублікавана ў дзевятнаццатым нумары газеты «Пшэдсвіт» у кастрычніку 1887 года — праз пэўны час пасля пакарання смерцю Ульянава. «Пшэдсвіт» быў друкаваным органам першай польскай рабочай партыі «Пралетарыят». Газета выдавалася ў Жэневе і Парыжы ў 1881—1887 гадах.

Як вядома, сярод бліскучай плеяды рэвалюцыянераў — папярэднікаў рускай сацыял-дэмакратыі віднае месца належыць Аляксандру Ульянаву. Яго светлы вобраз прыцягнуў да сябе ўвагу не толькі гісторыкаў, але і мастакоў слова. Польская паэма «Ульянаў» цікавая, прынамсі, у двух адносінах. Яна з'яўляецца, па першае, яшчэ адным пераканаўчым сведчаннем традыцыйных сувязей польскіх і рускіх рэвалюцыянераў, якія разам змагаліся супраць агульнага ворага — царскага самаўладства. Яшчэ калі Аляксандр Ульянаў быў вучнем Сімбірскай гімназіі, ён ведаў сына палітычнага ссыльнага паляка Вайцяхоўскага. У Пецярбургскім універсітэце ён дружыў з Лукашэвічам, адным з кіраўнікоў нелегальнай «Польскай касы» і актыўным удзельнікам падрыхтоўкі замаху на Аляксандра III. Вядома таксама, што Аляксандр Ульянаў падтрымліваў цесныя сувязі з палякамі-рэвалюцыянерамі, якія жылі ў Вільні. Ад іх, у прыватнасці, ён атрымаў азотную кіслату для прыгатавання дынаміту.

Ёсць звесткі аб сувязі групы Ульянава з першай польскай сацыялістычнай рабочай партыяй «Пралетарыят». Гэтая апошняя акалічнасць і з'яўляецца, відаць, прычынай таго, што якраз у органе гэтай партыі — газеце «Пшэдсвіт» з'явілася паэма «Ульянаў», паведамляе газета «Ульяновская правда».

На жаль, аўтар паэмы «Ульянаў» пакуль што яшчэ невядомы. Супрацоўнікі музея Ул. І. Леніна ў Варшаве лічаць, што верагодным аўтарам твора была адна з выдатных дзеячоў польскага сацыялістычнага руху Цэзарына Ванда Вайнароўская.

Польская паэма надзвычай цікавая для гісторыкаў і ўсіх чытачоў, якія глыбока цікавяцца біяграфіяй сям'і Ульянавых, тым, што ў ёй ёсць праўдзівыя малюнкі апошніх дзён жыцця Аляксандра Ільіча. Мы маем толькі падрадкоўны пераклад вершаванага тэксту. У гэтых радках—бясстрашнасць, упэўненасць у перамозе справы барацьбы за свабоду народа.

Асабліва хвалюючая сцэна спаткання ў крэпасці Марыі Аляксандраўны з сынам.

Вдруг побледнел он: кто-то камеру
открывает...
Это мать приходит в глубокой скорби,
Несчастный, не обнять тебе матери,
Что стоит, бледная, как грусти богиня,
Преградой тому и жандарм, и решетка,
И царь, который новые муки тебе причиняет.

А. І. Ульянаў, як вядома, адмовіўся прасіць літасці ў цара, і гэтай цэласнасцю яго натуры, якая захавалася да апошніх дзён яго жыцця, ганарыліся ўсе, хто ведаў бясстрашнага рэвалюцыянера. Вось як расказваецца пра гэта ў паэме:

Сын! Ты для меня все на свете...
Тут слезы прервали слова женщины,
И только взглядом его молила
Только стоном его просила.
Узник тряхнул кандалами своими!
Напрасно, мама, мечтают тираны
Сына твоего опозорить, сделать подлым,
Не хочу у врага милости просить,
Вины за собой никакой не чую.
Правду и добро я только любил.
За них охотно заплачу я жизнью!
Жизнь — не честь, пусть царь у меня
отбирает...
Светало... Румянцем кровавым загорался
восход,
Как бы стыдясь за славянский род, что
Сносит покорно неволю и кнут.
Матери уже не было в камере тюремной;
Жандарм ее с каменного пола поднял
Бесчувственной.

Малюючы сцэну пакарання смерцю, аўтар піша, што «спокойствием его чело сияло...» и далей: «Студент Ульянов умирал мужественно, уверенный, что придет час мщения».

Пётр СЫМКІН,
карэспандэнт АДН.



КАСТРЫЧНІЦКАЯ РАНІЦА. Фотаэцюд А. ГЛІНСКАГА.

# КОНКУРС НА ЛЕПШЫ ПАЛІТЫЧНЫ ПЛАКАТ

**Міністэрства культуры БССР, Камітэт па друку пры Савеце Міністраў БССР і Саюз мастакоў аб'яўляюць конкурс на лепшы палітычны плакат, які раскрывае сусветнае гістарычнае значэнне Вялікай Кастрычніцкай рэвалюцыі, кіруючую і арганізуючую ролю Ул. І. Леніна, Камуністычнай партыі Савецкага Саюза ў барацьбе за пабудову камунізма, за мір і дружбу паміж народамі, адлюстроўвае вялікія поспехі Беларускай ССР, дасягнутыя ў братэрскай сям'і савецкіх народаў у развіцці народнай гаспадаркі, навукі і культуры, у правядзенні ленінскай нацыянальнай палітыкі. Плакаты павінны раскрываць гістарычнае значэнне рашэнняў XXIII з'езда КПСС і барацьбу савецкага народа за іх ажыццяўленне.**

**Конкурс праводзіцца з 1 кастрычніка г. г. па 25 лютага 1967 года. Для ўдзелу ў конкурсе запрашаюцца прафесіянальныя мастакі, а таксама ўсе жадаючыя. Конкурсныя плакаты будуць выстаўлены для грамадскага прагляду і абмеркавання.**

**За лепшыя плакаты, якія будуць прадстаўлены на конкурс, устаноўлены прэміі.**

**З пытаннямі, якія датычаць праграмы конкурсу, можна звяртацца ў журы конкурсу (г. Мінск, Дом Урада, пакой 415).**

# АДКРЫЦЦІ РУСКАГА ПЕЙЗАЖА

*ВЫСТАЎКА Ў АКАДЭМІІ МАСТАЦТВАЎ СССР*

Повад для роздуму аб рускім пейзажы дае выстаўка трынаццаці яго буйнейшых майстроў, якая адкрылася ў Акадэміі мастацтваў да 50-годдзя Савецкай улады. Бакшэеў, Бродскі, Бяляніцкі-Біруля, Герасімаў, Грабар, Крымаў, Купрын, Мяшкоў, Астраумава-Лебедзева, Рылоў, Юон і Шэгаль, аб'яднаўшыся ў адной экспазіцыі, зрабілі шчаслівай нешчаслівую лічбу.

Ужо стала аксіёмай, што рускія пейзажы неад'емныя ад прыроды. Яны — жывыя яе кавалкі. Глядзячы на іх, можна змерзнуць на ветры, удыхнуць на ўсе грудзі веснавы рачны халадок, прамокнуць наскрозь ад дажджу, адчуць пах перагрэтай сонцам сасновай ігліцы.

Матэрыяльнасць і эмацыянальнасць заўсёды былі цудоўнымі якасцямі рускай пейзажнай школы. На цяперашняй выстаўцы глядач мае магчымасць атрымаць поўную ілюзію паездкі па Расіі. Ён не толькі ўбачыць, але адчуе і пачуе глухамань лясоў, цяжар навіслых дубовых кронаў і лёгкасць празрыста-зялёнага россыпу бярозавай звонкай лістоты; заблытаецца нагамі ў стракатым мурагу і патоне позіркам у зачараванай пустаце ледзь сінеючага неба. Тут соладка пахне ў бары ігліца. Вострая свежасць балоцістых нізін. Цяністыя быстрыні, дзе вада празрыстая, як сляза, хоць і здаецца чорнай. Неабсяжныя далі палёў. Словам, тут уся тая нягучная Расія з яе патаемнай ціхай прыгажосцю, што апісана Талстым, Буніным, Прышвіным, Паустоўскім.

Аднак паняцце аб пазасацыяльным лагодным пейзажы не адносіцца да рускага пейзажа і рускай школы мастакоў-пейзажыстаў, бо іх любоў да прыроды не бяздзейная і не сузіральная. Пейзаж — гэта сама Русь. І калі пачалася рэвалюцыя, пейзаж таксама становіцца ўдзельнікам рэвалюцыі. Першая шырока вядомая карціна Кастрычніка — напісаны ў 1917 годзе Аркадзем Рыловым пейзаж «Над блакітнай прасторай»... Шыракакрылыя лебедзі ляцяць над сінню мора, і асляпляльны блакіт сустракае іх, як мара пра новае шчаслівае жыццё, якое пабудуе вызвалены народ.

Розныя манеры кожнага з трынаццаці мастакоў, прадстаўленых на выстаўцы.

Буйныя мазкі, магутныя каляровыя плямы памагаюць Пятру Канчалоўскаму ўславіць маналітнасць старажытнарускай архітэктуры. Яго пейзажы Ноўгарада поўныя гордасці і велічнасці.

Анна Астраумава-Лебедзева піша «Нафтасховішча», «Від з Самсоньеўскага моста. Петраград. Баркі», «Паўлаўск. Від на перспектыву ад Канстанцінаўскага палаца». Самыя розныя сюжэты. Але і ў гарадскім і ў сельскім пейзажах яна ўмее падкрэсліць уласцівыя ім цэласнасць і здзіўляючую ўраўнаважанасць. Нават купы дрэў выглядаюць, як строгія вежы — ахоўніцы рускай прыгажосці.

Эфектна дэкаратыўны Крымаў, а побач гранічна стрыманы ў светлавой гаме Бяляніцкі-Біруля і тэмпераментны буйны Грабар. Дробны мазок цудоўна перадае ў Грабара гульню святла, веснавога сонца.

І, нарэшце, рускія пейзажы Сяргея Герасімава, напісаныя пад Мажайскам. Чалавек заўсёды прынцыповы, шчыры, ён і ў пейзажах сваіх заставаўся верны сабе — тая ж адкрытая руская душа.

Яго ўспрыняцце прыроды вельмі блізкае пісьменніку Буніну. «Сярэдняя наша Расія, — як тонка зазначае Паустоўскі, — паўстае ў Буніна ў прыгажосці шэрых дзён, спакоі палёў, дажджах і туманах, а часам у бледнай прамяністасці, у тлеючым шырокім заходзе сонца. Тут дарэчы будзе сказаць, што ў Буніна было рэдкае і беспамылковае адчуванне фарбаў і асвятленняў. Свет складаецца з вялікага мноства злучэнняў фарбаў і святла. І той, хто лёгка і дакладна ўлоўлівае гэтыя злучэнні, — найшчаслівейшы чалавек, асабліва, калі ён мастак або пісьменнік». Такім шчаслівым мастаком і быў Сяргей Герасімаў.

Такімі шчаслівымі былі ўсе трынаццаць мастакоў старэйшага пакалення, якія паклалі пачатак рускаму, савецкаму пейзажу.

Іх творчая сталасць прыпала на гады Кастрычніка. Яны прынялі яго і праклалі першыя шляхі мастацтва сацыялістычнага рэалізму. Ядро сёлетняй выстаўкі — работы 1917—24 гадоў, перыяду станаўлення Савецкай улады, і выстаўка на ўвесь голас гаворыць пра тое, як беражліва паставілася наша рэвалюцыя да сваёй культурнай спадчыны, як плённа працавалі ў першыя гады рэвалюцыі старыя майстры.

Агульны ўздым у краіне накладваў свой адбітак на пейзаж. Новае светаадчуванне нараджала цягу да манументальнасці, да больш абагуленага і цэласнага ўспрыняцця прыроды. Прыкметы бурнага часу ўзрываюць ідыліччную пастараль ціхіх лясоў і палёў.

Мастакі шукаюць новыя формы, новыя выяўленчыя сродкі, але як заканамерна захаваліся ў гэтых пошуках усе дасягненні рускай пейзажнай школы.

Міне амаль паўстагоддзя. У рускім пейзажы з'явяцца новыя імёны, набудуць папулярнасць новыя мастакі, такія, напрыклад, дыяметральна процілеглыя ў сваіх пошуках, як крайне лаканічны прыхільнік «аўтамабільнага бачання» Георгій Ніскі і паглыблены ў сябе лірык Мікалай Рамадзін. Але і ў іх творчасці, і ў творчасці ўжо іх вучняў захаваецца тое лепшае, што знайшлі першыя майстры рускага савецкага пейзажа.

А пра плённасць эстафеты пакаленняў можна меркаваць і па работах зусім маладых. Неўзабаве глядач зможа гэта праверыць і сам. Па добрай традыцыі Акадэміі ў тых залах, дзе цяпер паказаны мастакі самага старэйшага пакалення, праз некалькі месяцаў будзе адкрыта выстаўка маладых мастакоў.

Аляксандр БАЙГУШАЎ
(АДН).

# ЧАСОПІСЫ Ў КАСТРЫЧНІКУ

**«ПОЛЫМЯ»** У кастрычніцкай кнізе часопіса значнае месца займае паэзія. Тут надрукаваны новыя вершы Эдзі Агняцвет, Кастуся Цвіркі, Уладзіміра Караткевіча, Янкі Непачаловіча, паэма Пятра Прыходзькі «Апошняе пісьмо з вайны». Проза прадстаўлена аповесцю Івана Грамовіча «Яны далі слова» і апавяданнямі Аркадзя Марціновіча і Алеся Наўроцкага.

Пад рубрыкай «Нашы публікацыі» друкуюцца невядомыя вершы Янкі Купалы. У раздзеле «Публіцыстыка» змешчаны артыкул Анатоля Галаўко і Людмілы Прыходзькі «З вопыту мінулага» — аб калгассаюзах.

З цікавымі ўспамінамі выступае Яўген Рамановіч. У раздзеле «Крытыка і бібліяграфія» Іван Навуменка дзеліцца сваімі думкамі аб творчасці Янкі Купалы.

У часопісе змешчаны рэцэнзіі В. Чамярыцкага і С. Андраюка на кнігі В. Вольскага «Старонкі нашай гісторыі» і А. Куланоўскага «Першае чаканне». З наротнімі рэцэнзіямі выступаюць П. Дзюбайла і А. Каліновіч.

Аб народнай фразеалогіі піша Фёдар Янкоўскі. Міхась Клышка працягвае друкаваць матэрыялы да слоўніка сінонімаў і блізказначных слоў. У канцы часопіса — хроніка культурнага жыцця.

**«МАЛАДОСЦЬ»** Адкрываецца часопіс кнізкай вершаў Веры Вярбы. З новымі вершамі выступаюць Эдзі Агняцвет, Алег Лойка, Анатоль Сербантовіч, Уладзімір Васько. Часопіс друкуе пачатак рамана Алеся Ставера «Пад канвоем», апавяданні Міколы Гроднева і Ніны Маеўскай.

У раздзеле «50 год Вялікага Кастрычніка» змешчаны партыйны гімн «Інтэрнацыянал» у перакладзе Янкі Купалы. Аб творчай дзейнасці беларускіх кампазітараў у гады Айчыннай вайны пішуць музыказнаўцы Л. Мухарынская і М. Шыфрын. Мікола Базарэвіч у артыкуле «На ніве асветы» расказвае аб педагагічнай дзейнасці Якуба Коласа. У часопісе друкуюцца невядомыя пісьмы Якуба Коласа да літаратуразнаўцы Л. Бэндэ.

У артыкуле «Самы лёгкі ці самы цяжкі?» Алесь Яскевіч аналізуе беларускую лірычную прозу.

З рэцэнзіямі ў часопісе выступаюць Фёдар Яфімаў (Хведар Чэрня — «Добрай раніцы, людзі!») і Уладзімір Юрэвіч (М. Паўленка — «Кароткі нарыс гісторыі пісьма»). Аб цікавых фактах з жыцця і дзейнасці акадэміка Я. Ф. Карскага расказвае школьны інспектар Гродзенскага раённага аддзела народнай асветы А. Цыхун.

Пад рубрыкай «Усмешкі маладосці» выступаюць з гумарыстычнымі вершамі Пятро Сушко і Міхась Скрыпка. Багатыя, як заўсёды, раздзелы часопіса «Дзень сённяшні — дзень заўтрашні» і «Старты і фінішы».

**«БЕЛАРУСЬ»** Гэты нумар часопіса прысвечаны Магілёўшчыне. Тут выступае першы сакратар Магілёўскага абкома партыі, кандыдат у члены ЦК КПСС Г. А. Крылін. Аб магілёўскіх металургах піша Я. Тарасаў. У артыкуле Г. Барышэўскага «Радок з дырэктыў» расказваецца аб будаўніцтве Бабруйскага шыннага завода. Пётр Шасцерыкоў піша пра абарону Магілёва ў 1941 годзе. Пад рубрыкай «Яны з Магілёўшчыны» дырэктар Крычаўскага краязнаўчага музея М. Мельнікаў расказвае аб слаўных сынах Магілёўшчыны, бакінскіх намісарах Якаве Зевіне і Міхаіле Басіне. У артыкуле «Беларускі Зорге» Я. Семяжон піша пра Героя Савецкага Саюза Льва Яфімавіча Маневіча.

Літаратурная частка часопіса прадстаўлена новымі вершамі А. Пысіна, П. Прыходзькі, П. Прудніка, А. Канапелькі, В. Матэвушава, Э. Агняцвет, В. Карпечанкі, В. Ракава. У нумары друкуецца заканчэнне аповесці К. Кірэенкі «Паводка», апавяданне А. Кудраўца «Іваніха», урывак з п'есы І. Ісачанкі «Мурын Бор», гумарэскі І. Аношкіна.

У часопісе надрукаваны рэцэнзіі М. Досіна, Ан. Шаўні. І. Клаз піша аб адкрыцці філіяла літаратурнага музея Янкі Купалы ў Ляўках.

У кастрычніцкім нумары часопіса змешчана шмат іншых цікавых матэрыялаў з жыцця нашай рэспублікі.

**«НЕМАН»** У дзесятым нумары надрукаваны вершы М. Хведаровіча (пераклад І. Васілеўскага), М. Капанёва, Ю. Лакербая, Д. Сімановіча.

Проза прадстаўлена апавяданнямі Я. Брыля (пераклад А. Астроўскага), Э. Карпачова, Г. Папова і аповесцю А. Асіпенкі «Абжыты кут» (пераклад М. Гарбачова). У часопісе надрукаваны таксама «Партызанскія былі» І. Пятроўскага.

Аб праблеме водазабеспячэння беларускіх гарадоў расказваецца ў нарысе Н. Цыпіса.

У раздзеле «Запісні, успаміны, дакументы» публікуюцца матэрыялы аб народніках на Беларусі.

«У краіне кенгуру» — так называюцца дарожныя нататкі Ул. Тамашуноса. Да 900-годдзя нашай сталіцы часопіс змясціў артыкул пра сярэдневяковы Мінск.

У раздзеле «Крытыка» надрукаван артыкул Н. Пашкевіча аб рамане А. Чарнышэвіча «На рубяжы вякоў». Пад рубрыкай «Знойдзена ў архівах» апублікаваны новыя матэрыялы, якія адносяцца да дзейнасці Адама Багдановіча—этнографа.

# І АСАБІСТАЯ ТРАГЕДЫЯ, І СТРАТА ДЛЯ КУЛЬТУРЫ

Таленавіты фінскі пісьменнік Крыстэр Кільман звярнуўся з адкрытым пісьмом да грамадскасці, у якім ён заяўляе, што з-за цяжкага матэрыяльнага становішча ён адмаўляецца ад пісьменніцкай прафесіі і выходзіць з Саюза пісьменнікаў. Гэты 36-гадовы пісьменнік, які займаўся літаратурнай дзейнасцю 15 год, піша: «Пісьменнік у Фінляндыі не можа жыць сваёй творчасцю, як бы старанна ён ні працаваў. Я стаміўся ад клопатаў пра заўтрашні дзень, стаміўся ад фізічнага і духоўнага нацяжэння ў якой я пражыў усё сваё свядомае жыццё».

Гэта поўнае расчаравання пісьмо выклікала водгукі ў асяроддзі пісьменнікаў, мастакоў і іншых работнікаў культуры. У газетах надрукавана пісьмо вялікай групы фінскіх пісьменнікаў, у якім гаворыцца, што «калі таленавіты пісьменнік пасля паспяховай літаратурнай дзейнасці «кідае сваю сякеру ў возера», дык гэта з'яўляецца адначасова і асабістай трагедыяй, і вялікай стратай для культуры».

Становішча пісьменнікаў і іншых работнікаў мастацтва Фінляндыі сапраўды цяжкае. Саюз пісьменнікаў Фінляндыі паведамляе, што толькі пяць працэнтаў пісьменнікаў краіны могуць існаваць на сродкі, якія яны атрымліваюць ад літаратурнай работы. Паводле звестак газет, 26 пісьменнікаў, якія пішуць на шведскай мове, атрымалі два гады назад за свае творы ў сярэднім толькі 544 маркі (у год). Гэтых сродкаў не хапае на мінімальныя выдаткі нават на месяц.

Пісьменнік Крыстэр Кільман гаворыць з гэтага поваду: «Я не ўмею прадаваць сябе за найвышэйшую цану і прыстасоўвацца да становішча, калі ад літаратурнай дзейнасці ва ўмовах капіталістычнага грамадскага ладу патрабуецца прадажнасць для таго, каб гэтая дзейнасць прыносіла прыбытак».

Карл РАНТА,
карэспандэнт ТАСС.
Хельсінкі.

# ТЭЛЕБАЧАННЕ

**11 кастрычніка**

**Першая праграма.** 11-00 — тэлевізійныя навіны (М). 11-20—«Подзвіг». Тэлевізійны альманах (М). 12-00 — «Галы, ачкі, секунды». Спорт за тыдзень (М). 16-45 — праграма перадач. 16-50 — для школьнікаў. «У майстэрні хлапатуна». Перадача з Тбілісі. 17-20 — «Сельская навіна» (М). 17-50 — Тыдзень таджыкскай літаратуры ў Беларусі. Выступленне таджыкскіх пісьменнікаў і паэтаў. 18-20 — вывучаючым марксісцка-ленінскую тэорыю. Асновы палітычных ведаў. Перадача першая. «Эканамічная аснова савецкага грамадства». «Ленінскія прынцыпы кіравання народнай гаспадаркай» (М). 19-00 — для малышоў. «Прыгоды плюшавага Мішкі». Прэм'ера кінафільма Беларускага тэлебачання. 19-15 — тэлевізійныя навіны. 19-25 — «Вячэрнія сустрачы». Музычная праграма (М). 20-30 — тэлевізійныя навіны (М). 21-00 — «Адно лета ў Суздалі». Кінанарыс. 21-30 — канцэрт вакальна-інструментальнага ансамбля «Арэра». Перадача з Тбілісі. 22-00 — «Бывае і гэтак». Мастацкі фільм.

**Другая праграма.** 17-50 — «Поры года». Музычны антракт (М). 18-00 — тэлевізійныя навіны (М). 18-20 — для дзяцей. «Прыгоды шахматнага салдата Пешкіна». Фільм-балет. 19-00 — «Праездам». Тэлевізійны мастацкі фільм Свярдлоўскай студыі (М). 19-25 — фестываль фільмаў Таджыкістана. «Што такое шчасце». Дакументальны фільм. Вытворчасць кінастудыі «Таджыкфільм». 20-20 — майстры мастацкага слова. Уладзімір Тулубʼеў. 21-00 — «Тавы, юнацтва!» Перадача з Ленінграда. 21-30 — «Ташкент — горад мірны». Дакументальны фільм. 22-00 — літаратурны альманах «Паэзія» (М).

**12 кастрычніка**

**Першая праграма.** 11-00 — тэлевізійныя навіны (М). 11-15 — «Свята працоўнай славы». Ушанаванне ўдарнікаў камуністычнай працы электралампавага завода (М). 12-10 — канцэрт (М). 15-55 — праграма перадач. 16-00 — школьная фільматэка. «Гора ад розуму». Фільм-спектакль. 1-я серыя. 17-15 — «Салдат неба». Таленарыс пра маршала авіяцыі Героя Савецкага Саюза С. А. Красоўскага (М). 17-30 — «Калі ажываюць легенды». Трансляцыя на Маскву. 18-00 — для дзяцей. «Дзеці і чайкі». Кароткаметражны фільм. 18-15 — тэлевізійныя навіны. 18-30—на Кубак еўрапейскіх чэмпіёнаў па футболу. «Тарпеда» (Масква) — «Інтэрнацыянале» (Мілан). 20-15 — А. П. Чэхаў. «Дзядзя Ваня». Спектакль Беларускага акадэмічнага тэатра імя Я. Купалы.

**У дапамогу завочнікам (для студэнтаў ВНУ).**

23-15 — «Вышэйшая матэматыка». Лекцыя 2-я. 23-45 — «Начартальная геаметрыя». Лекцыя 2-я.

**Другая праграма.** 16-45 — для школьнікаў. «Школа пачынаючага спартсмена» (М). 17-15 — «Ціхая раніца». Тэлевізійная навела. 17-30 — «На зямлі братняй Манголіі». Кінанарыс. 18-00 — тэлевізійныя навіны (М). 18-30 — «Імя Радзішчава». Кінанарыс. 19-00 — «Праверана — мін няма». Мастацкі фільм. Вытворчасць кінастудыі імя А. Даўжэнкі і кінастудыі «Лоўчэнфільм», Югаславія. 20-30 — тэлевізійныя навіны (М). 20-50 — навіны польскай суднабудаўнічай прамысловасці. Перадача з Польшчы. 21-15 — тэлевізійны тэатр мініяцюр. «Добры вечар!» (М). 22-05 — Маскоўская дзяржаўная кансерваторыя. Да 100-годдзя з дня заснавання. Перадача другая (М).

**13 кастрычніка**

**Першая праграма.** 16-05 — праграма перадач. 16-10 — школьная фільматэка. «Падарунак Грыбаедава». Кінанавела. «Гора ад розуму». Фільм-спектакль. Другая серыя. 17-50 — тэлевізійныя навіны. 18-00 — «Свет сёння» (М). 18-30 — да 50-годдзя Савецкай улады. Ю. Яноўскі. «Лютасць». Спектакль Ленінградскага дзяржаўнага акадэмічнага тэатра драмы імя Пушкіна. Перадача з Ленінграда. У перапынках — тэлевізійныя навіны (М). 21-40 — да 50-годдзя Савецкай улады. «Ордэн «Знак Пашаны». Тэлерасказ пра калектыў 11-й аўтабазы. 22-30 — «Паэзія восені». Харэаграфічныя мініяцюры. Перадача з Бухарэста. 23-00—«Матч сяброў». Аб таварыскай сустрэчы па цяжкай атлетыцы. Казахстан — Беларусь.

**Другая праграма.** 16-50 — для дзяцей. «Піянерыя». Кінахроніка (М). 17-00 — для школьнікаў. «Вясёлы поезд». Перадача з Ленінграда. 17-30 — «Старонкі паэзіі». Н. Рыбалка. Перадача з Данецка. 18-00 — «Наследнікі». Перадача прысвечана моладзі, якая ідзе служыць у Савецкую Армію. 18-30 — для малышоў. «Клуб вясёлых чалавечкаў. Лялечны фільм. 19-00 — эстрадны канцэрт артыстаў Адэскай эстрады. 21-40 — «Веды». Навукова-пазнавальная праграма (М).

ЮНЫЯ ФОТААМАТАРЫ. Фотаэцюд С. АНАНКІ.

# СУСТРЭЧА СЯБРОЎ

У Доме мастацтваў адбылася сустрэча артыстаў беларускіх тэатраў і кіно з артыстамі польскага цырка, які знаходзіцца на гастролях у Мінску.

Ад імя творчай інтэлігенцыі сталіцы гасцей вітаў народны артыст рэспублікі С. С. Бірыла. Са словам у адказ выступіў дырэктар калектыву артыстаў польскага цырка Альгерд Каспарык. Ён горача падзякаваў гледачам і работнікам мастацтва Мінска за гасцінны, братэрскі прыём, расказаў пра гісторыю польскага цырка, падзяліўся сваімі ўражаннямі аб гастролях у Савецкім Саюзе і адказаў на шматлікія пытанні.

Затым адбыўся вялікі канцэрт дружбы.

Гасцей шчодра адарылі кветкамі і сувенірамі. Прыемны падарунак ім падрыхтавалі беларускія кінематаграфісты. На сустрэчы быў паказаны толькі што закончаны вытворчасцю кіначасопіс «Мастацтва Беларусі» № 3 (рэжысёр-аператар Віктар Шаталаў), адзін з сюжэтаў якога расказвае пра гастролі артыстаў польскага цырка ў беларускай сталіцы.

І. РЭЗНІК.

# ПЕСНЯ ШАФЁРА

Ішоў заключны канцэрт мастацкай самадзейнасці Хойніцкага раёна.

— Песню Блантэра «Гарматы маўчаць дальнабойныя» выконвае Іосіф Чарнецкі,—аб'явілі са сцэны. Гэтае прозвішча было новым для прысутных. На сцэну выйшаў невысокага росту хлопец. Відаць было, як ён хваляваўся. Ды і як не хвалявацца, калі на цябе глядзяць столькі вачэй! І вось зала напоўнілася звонкай мелодыяй песні. Чысты, душэўны голас маладога спевака зачараваў слухачоў. Яны выклікалі Іосіфа некалькі разоў на «біс». Гэта быў першы поспех маладога спевака. Яго заўважылі і члены журы і вылучылі І. Чарнецкага на заключны канцэрт у Гомель, які адбыўся вясною гэтага года. І там малады спявак выступіў з поспехам.

Цяпер Іосіф—адзін з актыўных удзельнікаў мастацкай самадзейнасці Хойніцкага Дома культуры.

Працуе І. Чарнецкі шафёрам на аўтабазе. І ў працы з яго бяруць прыклад іншыя. Удзень Іосіф за рулём, а ўвечары—на сцэне. І песня і праца служаць людзям.

Цяпер малады спявак рыхтуе новую праграму, з якой выступіць у дні святкавання Вялікага Кастрычніка.

А. БОНДАР.


ЧЫТАЙЦЕ І ВЫПІСВАЙЦЕ ГАЗЕТУ

«ЛІТАРАТУРА І МАСТАЦТВА»

**ДАРАГІЯ ЧЫТАЧЫ!**

**Працягваецца падпіска на газеты і часопісы на 1967 год. Звяртаемся да вас з просьбай: своечасова, не адкладваючы на апошнія тыдні года, падпісвайцеся на газету «Літаратура і мастацтва»!**

Газета разлічана на шырокае кола творчай інтэлігенцыі, работнікаў культуры, кінафікацыі, аматараў літаратуры і мастацтва. На старонках газеты вы зможаце прачытаць новыя апавяданні, вершы, урыўкі з раманаў і аповесцей беларускіх пісьменнікаў, рэцэнзіі на кнігі, спектаклі, кінафільмы.

*«Літаратура і мастацтва» знаёміць чытачоў з тэатральным, музычным, архітэктурным, культурным жыццём рэспублікі, друкуе выступленні пісьменнікаў, журналістаў, дзеячоў культуры і мастацтва па грамадскіх і маральна-этычных праблемах. Шырокае адлюстраванне знаходзяць у газеце пытанні вытворчай эстэтыкі.*

Падпіска на газету «Літаратура і мастацтва» прымаецца без абмежаванняў у гарадскіх аддзяленнях «Саюздруку», у канторах і аддзяленнях сувязі, а таксама грамадскімі распаўсюджвальнікамі друку.

Газета выходзіць два разы на тыдзень.

ПАДПІСНАЯ ЦАНА:

на год — 4 руб. 20 кап.,
на 6 месяцаў — 2 руб. 10 кап.,
на 3 месяцы — 1 руб. 05 кап.
на 1 месяц — 35 кап.

У розніцу газета паступае ў абмежаванай колькасці.



**БЕЛАРУСКАЯ ДЗЯРЖАЎНАЯ КАНСЕРВАТОРЫЯ ІМЯ А. В. ЛУНАЧАРСКАГА**

**АБ'ЯЎЛЯЕ ДАДАТКОВЫ ПРЫЁМ У АСПІРАНТУРУ**

**з адрывам ад вытворчасці па спецыяльнасці скрыпка**

*Паступаючыя ў аспірантуру здаюць конкурсныя экзамены па спецыяльнасці, гісторыі КПСС і адной з замежных моў (англійскай, французскай, нямецкай або італьянскай) у аб'ёме праграмы кансерваторыі.*

**У экзамен па спецыяльнасці ўключаюцца:**

а) выкананне сольнай праграмы — 30 мінут (абавязковае выкананне поліфанічнага твора і твора савецкага кампазітара);

б) калёквіум па пытаннях выканаўчага майстэрства, методыкі і педагогікі.

Заявы аб прыёме падаюцца на імя рэктара кансерваторыі (гор. Мінск, Інтэрнацыянальная, 30) з прыкладаннем: асабовага лістка па ўліку кадраў з фотакарткай, характарыстыкі з апошняга месца работы або навучальнай установы, якая рэкамендуе ў аспірантуру, выпіскі з пратакола савета для асоб, рэкамендаваных саветамі вну ў аспірантуру.

Пашпарт і дыплом аб заканчэнні вну прад'яўляюцца асабіста. Заявы прымаюцца да 20 лістапада 1966 г.

Прыёмныя экзамены з 21 лістапада па 1 снежня 1966 г.

*Асобам, дапушчаным да прыёмных экзаменаў, даецца месячны адпачынак з захаваннем заработнай платы па месцы работы для падрыхтоўкі і здачы прыёмных экзаменаў, згодна з палажэннем аб аспірантуры.*

РЭКТАРАТ.



Галоўны рэдактар Н. Е. ПАШКЕВІЧ.

Рэдакцыйная калегія: З. І. АЗГУР, Г. М. БУРАЎКІН, А. І. БУТАКОЎ, К. Л. ГУБАРЭВІЧ, Т. А. ДУБКОВА, Г. М. ЗАГАРОДНІ, В. Ул. ІВАШЫН, А. М. КАШКУРЭВІЧ, В. Б. ЛАДЫГІНА, П. М. МАКАЛЬ, А. Н. МАРЦІНОВІЧ, Р. К. САБАЛЕНКА (намеснік галоўнага рэдактара), І. А. САНКОВА, З. Ф. СТОМА, М. Г. ТКАЧОЎ, Р. Р. ШЫРМА.


Калектыў Рэспубліканскага Дома народнай творчасці смуткуе з выпадку трагічнай гібелі старэйшага артыста і рэжысёра тэатральных калектываў мастацкай самадзейнасці П. А. Данукі і выказвае глыбокае спачуванне сям'і і сваякам нябожчыка.


«Літаратура і мастацтва» выходзіць у аўторан і пятніцу.

НАШ АДРАС І ТЭЛЕФОНЫ: г. Мінск, вул. Захарава, 19. Тэлефоны: прыёмнай рэдактара — 3-44-04, аддзела літаратуры — 3-21-53, аддзела тэатра, кіно і чай эстэтыкі — 3-24-62, аддзела выяўленчага мастацтва, архітэктуры і вытворчасці — 3-24-61, намесніка галоўнага рэдактара — 3-25-25, адказнага сакратара — 3-44-04, аддзела музыкі — 3-24-62, аддзела тэатра, кіно і публіцыстыкі — 3-22-04, аддзела інфармацыі — 3-44-04, нарэспандэнцкага пункта ў Гомелі — 2-70-83, выдавецтва — 6-25-19, бухгалтэрыі — 6-97-44.

«Литература и искусство»—орган Министерства культуры и правления Союза писателей БССР. Минск.

Індэкс 63856, Друкарня выдавецтва «Звязда». АТ 02648